Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 ЛІСТАПАДА 2017 г. ЧАЦВЕР №221 (28585)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Хто працуе «нарка-гандляром»?

СТАР. 11

Ці існавала Атлантыда?

СТАР. 12

Адэскія нататкі

СТАР. 13

ВЯСЁЛКА Ў ЛІСТАПАДЗЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вясковец-пенсіянер з Салігоршчыны Рыф СІБАГАТУЛІН вырашыў «амаладзіць» свой дом і аздобіў фасад яркай мазаікай. Для гэтага яму не спатрэбіліся сучасныя будматэрыялы накшталт вагонкі і сайдынгу, фарбаў і лакаў. Ён знайшоў свой метад — арыгінальны, танны і даступны для кожнага. Майстар і мастак у адной асобе, ён лічыць: каб «пераапрануць» дом у такі прывабны строй, трэба мець трохі цярпення, вобразнае ўяўленне сваёй ідэі і любоў да калекцыянавання. СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр КАНЮК, генеральны пракурор:

«Некалькі гадоў таму быў прыняты закон аб барацьбе з карупцыяй. Я лічу, што ён адпавядае часу, таму становішчу рэчаў, якое ў нас у краіне. Гаварыць сёння аб нейкім істотным удасканаленні заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй няма неабходнасці. У Беларусі расце колькасць выяўленых карупцыйных злачынстваў. Мы звязваем гэта з тым, што актывізавалася дзейнасць у гэтым кірунку праваахоўных органаў — МУС, КДБ, пракуратуры».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.11.2017 г.

Долар ЗША	2,0057	▲
Еўра	2,3702	▲
Рас. руб.	0,0332	▼
Укр. грыўня	0,0757	▲

ISSN 1990 - 763X

■ Тэхналогіі

ГАМЕАПАТЫЯ КІБЕРБЯСПЕКІ,

ці Як правільна сачыць за персанальнымі данымі

Мы жывём у эпоху, калі вакол нас развіваецца інтэрнэт рэчаў, разумныя дамы і аўтаномныя гарады. З кожным годам чалавецтва ўсё больш становіцца залежным ад лічбавых тэхналогій. Прамысловая вытворчасць, бізнес-працэсы ўсё часцей разлічваюцца і выконваюцца камп'ютарнымі праграмамі. Парадокс лічбавага стагоддзя заключаецца ў тым, што мы навучыліся ахоўваць сваё здароўе, але не ведаем, як сачыць за сваімі персанальнымі данымі. Часта замест таго, каб выкарыстоўваць «кібермедыцыну», якая мае на ўвазе веданне «слабых месцаў», і таго, як паменшыць іх колькасць, некаторыя ўсё яшчэ звяртаюцца да ненадзейнай і непрадказальнай гамеапатыі. Гэтая тэма шырока абмяркоўвалася падчас XIX Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў. Стваральнік адной з вядучых кампаній у сферы кібербяспекі Group-IB Ілья САЧКОЎ, які ўваходзіць у топ-30 паспяховых маладых людзей па версіі часопіса Forbes, падчас фестывальнага тыдня расказаў пра тое, як ахоўваць сваю прысутнасць у сеціве і чаму хакераў не варта ідэалізаваць.

НЕДААЦЭНЕНАЯ ПАГРОЗА І «РАМАНТЫЧНЫ ВОБРАЗ»

Ілья Сачкоў паспеў паўдзельнічаць у раскрыцці больш як 1000 крымінальных спраў супраць камп'ютарнай злачыннасці. Асноўная яго задача заключаецца ў тым, каб разумець, як думаюць хакеры, і дапамагаць знаходзіць іх. «Мы працуем у больш чым 60 краінах свету. У нашым штаце больш за 200 чалавек. Мы ведаем, што такое камп'ютарная злачыннасць і распрацоўваем тэхналогіі, якія дазваляюць спыняць хакераў яшчэ на этапе падрыхтоўкі», — расказаў эксперт. На яго думку, дзякуючы лічбавым тэхналогіям чалавецтва сёння жыве ў самы бяспечны час з пункту гледжання гісторыі. СТАР. 7

■ Бліжэй да прыроды

У ПОШУКАХ САПРАЎДНАГА

Сям'я мінчан пераехала ў вёску і разводзіць маламутаў

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ён — былы спартсмен, чэмпіён па бодзібілдынгу. Яна — гаспадыня чайнай школы. Шэсць гадоў таму Кірыл і Таццяна ДУБКОВЫ вырашылі, што кар'ера ў сталіцы — гэта не тое, на што хочацца траціць жыццё, і перабраліся ў вёску Горная Рута, за восем кіламетраў ад Карэлічаў. Цяпер іх ажно да лістапада радуюць ружы за акном, а кампанію ў хатніх справах складаюць ездавыя сабакі. СТАР. 5

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Выбары-2018

ВЫЗНАЧАНЫ КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН

Лідзія Ярмошына дала парады кандыдатам у дэпутаты

З датай выбараў вызначыліся яшчэ раней (18 лютага 2018 года), а ўчора ўдакладнілі план правядзення выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў 28-га склікання. Пра гэта падчас пасяджэння Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў заявіла яе старшыня Лідзія ЯРМОШЫНА.

Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў павінны быць створаны не пазней за 24 лістапада. «Паколькі ў Беларусі 1309 мясцовых Саветаў (з улікам сельскіх), адпаведна 1309 тэрытарыяльных камісій павінна быць створана не пазней за 24 лістапада. Крайні тэрмін падачы дакументаў — 21 лістапада, — удакладніла Лідзія Ярмошына. — Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах дэпутатаў абласнога Савета і Мінскія раённыя камісіі (іх будзе 9) утворацца не пазней за 4 снежня». Не пазней за 29 лістапада ў друку павінны з'явіцца спісы выбарчых акруг — іх нумары, апісанне і найменне.

Участкі для галасавання ўтворацца не пазней за 16 снежня, участковыя выбарчыя камісіі — не пазней за 3 студзеня. «І гэта самы напружаны момант, бо апошні тэрмін падачы дакументаў аб вылучэнні ў склад участковых выбарчых камісій — 31 снежня гэтага года, прычым гэта нядзеля. Зразумела, павінна быць арганізавана дзяжурства», — адзначыла старшыня Цэнтрвыбаркама.

Не пазней за 7 лютага выбаршчыкам павінны быць накіраваны запрашэнні прыйсці на выбарчыя ўчасткі, а ўчастковыя выбарчыя камісіі павінны быць забяспечаны бюлетэнямі для галасавання не пазней за 12 лютага.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты будзе ажыццяўляцца з 10 снежня па 8 студзеня — апошні дзень здачы дакументаў на рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты. Рэгістрацыя пройдзе з 9 па 18 студзеня. Пасля правядзення рэгістрацыі стартуе перыяд перадвыбарчай агітацыі, які працягнецца да 18 лютага ўключна.

«Цяпер каляндарны план дапаўняецца спецыяльным раздзелам, які датычыцца стварэння асабістых выбарчых фондаў кандыдатаў у дэпутаты. У ім прадугледжаны як тэрміны стварэння фондаў, якія адкрываюцца з дня рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, у асноўным пасля 18 студзеня, так і тэрміны справаздач, якія павінны быць прадастаўлены пасля выбарчай кампаніі», — паведаміла Лідзія Ярмошына. Пры гэтым яна заявіла журналістам, што, хутчэй за ўсё, фонды не стануць трэндам гэтай выбарчай кампаніі. І ўвогуле мясцовыя выбары можна правесці не ўкладаючы ўласных сродкаў: памяшканні для сходаў выдзяляюцца бясплатна, палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні таксама без грошай падтрымаюць сваіх кандыдатаў.

Патэнцыйным кандыдатам у дэпутаты старшыня ЦВК параіла, перш за ўсё, шукаць тых людзей, якія будуць збіраць за іх подпісы, альбо тыя працоўныя калектывы (у якіх, дарэчы, яны могуць і не працаваць), якія згодны іх вылучыць кандыдатамі ў дэпутаты. «На гэтых выбарах дзейнічае прынцып «глебы». Вылучацца кандыдатам у дэпутаты можна па тым мясцовым Савеце, дзе ён ці яна пражывае і (ці) працуе. Можна, вядома ж, не пражываць і не працаваць, але гэта для работнікаў асобных устаноў, якія абслугоўваюць сацыяльныя патрэбы рэгіёна, — паведаміла Лідзія Ярмошына. — Акрамя таго, кандыдатам у дэпутаты трэба ведаць, што яны маюць права адначасова абірацца па некалькі відах Саветаў». Калі, напрыклад, кандыдат пражывае на тэрыторыі сельскай мясцовасці, то ён можа выбірацца і ў абласны Савет, і ў раённы, і ў сельскі, але ў Саветы аднаго ўзроўню — нельга. Больш падрабязна тлумачэнні ЦВК дасць непасрэдна перад самім вылучэннем.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА

Семінар па Мэтах устойлівага развіцця (МУР) прайшоў у Мінску

Ёсць прапанова ў лютым сабраць разам усіх нацыянальных каардынатараў ці кіраўнікоў дзейнасці па дасягненні МУР Еўропы і СНД у Беларусі на форум. Акрамя іх, запрасіць і кіраўніцтва ААН. Пра гэта перад семінарам журналістам расказала Мар'яна ШЧОТКІНА, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

По словах Мар'яны Шчоткінай, міжнародныя эксперты ўжо адзначылі, што наша краіна падышла больш сістэмна да дасягнення МУР, чым шэраг іншых дзяржаў. У Беларусі, напрыклад, акрамя нацыянальнага каардынатара, працуе Савет па ўстойлівым развіцці, які курыруе работу па чатырох асноўных кірунках: эканоміка, экалогія, сацыяльная палітыка, статыстыка. Да таго ж створаны парламенцкая група і група партнёраў, куды ўваходзяць грамадскія аб'яднанні. Дарэчы, у снежні пройдуць парламенцкія слуханні на базе Савета Рэспублікі, тэмай якіх стане партнёрства і ўзаемадзеянне ўсіх галін улады і грамадзянскай супольнасці па дасягненні МУР.

Напрыканцы лістапада ў Беларусь прыедуць міжнародныя эксперты, каб ацаніць стартавыя пазіцыі краіны, а пасля маніторынгу падкажуць напрамкі працы. «У Мэт устойлівага развіцця ёсць адзін добры дзівіз — нікога не пакінуць убаку. Дасягнуць гэтага магчыма толькі сумеснымі намаганнямі ўсёй грамадзянскай супольнасці і ўсіх галін улады», — адзначыла Мар'яна Шчоткіна.

Пастаянны каардынатар ААН, пастаянны прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі Санака Самарасінха адзначыў, што ў нашай краіне дастаткова высокі ўзровень чалавечага развіцця, таму ў нас ёсць увесь патэнцыял, каб дасягнуць МУР. Па яго словах, дзяржавы сыходзяцца на тым, што працаваць трэба супольна. Важна, каб і грамадскія аб'яднанні, і прыватны сектар, і моладзь былі ўключаны ў гэты працэс.

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

■ Меркаванне

Канфлікт або кааперацыя?

Ініцыятыва Кітая «Адзін пояс — адзін шлях» накіравана на павелічэнне канфрантацыі або на кааперацыю паміж самымі буйнымі сусветнымі ігракамі?

У аснове ініцыятывы ляжаць шматлікія інтарэсы Кітая, якія немагчыма звесці да адной геапалітычнай парадыгмы.

Ініцыятыва «Адзін пояс — адзін шлях» адпавядае трэндам глабалізацыі.

Па-першае, глабалізацыя характарызуецца рэзкім ростам тавараабароту ў сусветных маштабах, а гэта немагчыма зрабіць без паляпшэння гандлёвых маршрутаў, у тым ліку рэанімуючых, якія актыўна выкарыстоўваліся ў мінулым, але прыйшлі ў заняпад з тых ці іншых прычын.

Па-другое, глабалізацыя спрыяе тэхналагічнаму росту, што выяўляецца ў з'яўленні тэхналогій, якія робяць сухапутныя маршруты з вялізным лагістычным плячом больш прывабнымі, чым раней, у параўнанні з самымі таннымі ў свеце марскімі маршрутамі. Кітай ужо мае самы сур'ёзны ў свеце зачын па выкарыстанні хуткасных чыгунак, у яго ж ёсць і самы прасунуты тэхналагічны патэнцыял у гэтай сферы.

Па-трэцяе, глабалізацыя вывела на парадак дня пытанне больш жорсткай канкурэнцыі паміж вытворцамі. Жыццёвы цыкл многіх тавараў імкліва скарачаецца. Становіцца крытычна важным не проста вырабіць хутка найноўшы тавар, але і даставіць яго першым спажыўцам. Той, хто можа з гэтым справіцца, атрымлівае найбольшы прыбытак. Той, хто спазняецца, задавольваецца рэшткамі. Кітай, які валодае найбольшым прамысловым патэнцыялам у свеце, найбольш востра сутыкаецца з гэтай дылемай. З аднаго боку, ён зацікаўлены ў тым, каб заводы і працоўныя месцы заставаліся на яго тэрыторыі. З іншага — Еўрапейскі саюз з'яўляецца адным з трох яго найлепшых рынкаў, і кітайскія тавары павінны з'яўляцца на ім раней, чым у яго азіяцкіх і амерыканскіх канкурэнтаў для максімізацыі прыбытку. Марскія перавозкі да ЕС з Кітая займаюць 5—6 тыдняў, і пагружаны на караблі тавар часта старэе да моманту дастаўкі. Чыгуначныя перавозкі скарачаюць час удвая пры выкарыстанні існуючых маршрутаў, пабудаваных у асноўным на базе састарэлых тэхналогій мінулага стагоддзя. Будаўніцтва хуткасных чыгунак па наяўных у КНР тэхналогіях скароціць час дастаўкі тавару з Кітая да рынкаў ЕС да двух-трох сутак. Працоўныя месцы і фабрыкі застануцца ў Кітаі, а тавар будзе раней, чым у іншых азіяцкіх канкурэнтаў, трапляць на выгадны рынак ЕС, здымаючы максімальныя вяршкі з продажаў.

Па-чацвёртае, Кітай аб'ектыўна з'яўляецца краінай, якая атрымлівае найбольшыя выгады ад глабалізацыі. У выніку ў яго з'явіліся велізарныя фінансавыя актывы, якія перапраўляюць кітайскі рынак сваёй прысутнасцю. Гэта небяспечная сітуацыя, якая цягне за сабой узнікненне «фінансавых бурбалак». Частка фінансавых актываў Кітая выводзіцца ў астатнія краіны Азіі, найбольш звыклы рэгіён для інвеставання для кітайскіх прадпрымальнікаў. Але хутка і Азіі будзе мала. Таму трэба прывучаць кітайскі бізнес інвеставаць за межы Азіі, чаму адпавядае і выхад Кітая на перадавыя пазіцыі ў свеце па памеры эканомікі. Праблема ў тым, што многія кітайскія бізнесмены баяцца інвеставаць за межы Азіі. Там для іх зусім нязвыклыя ўмовы, якія адрозніваюцца ад Азіі не ў лепшы бок, пачынаючы ад менталітэту работнікаў да складанага працоўнага заканадаўства і строгіх экалагічных патрабаванняў. Але прывучаць іх да новых прастораў і размаху кітайскай эканомікі ў сусветным маштабе трэба. Ініцыятыва Кітая «Адзін пояс — адзін шлях» дазволіць асвоіць сотні мільярдаў долараў «лішніх грошай» па-за межамі Кітая, а таксама стварыць інфраструктуру КНР на тэрыторыі Еўразіі, якая будзе прадстаўляць для кітайскіх інвестараў «астраўкі» кітайскай прысутнасці, узаемадзейнічаючы з якімі лягчэй пойдзе і працэс інвеставання, у тым ліку і на тэрыторыі геаграфічнай Еўропы.

З геапалітычнага пункту гледжання Кітай памятае пра тое, што напад Японіі на ЗША ў 1941 годзе стаў адказам на блакаду падвозу сыравінных рэсурсаў, без якіх не магла развівацца японская эканоміка. Безумоўна, такая блакада была адэкватным адказам на агрэсіўную палітыку Японіі ў рэгіёне. У той жа час рост кітайскай эканомікі непазбежна прывядзіць і да росту супярэчнасцяў з ЗША, якія ўжо прызвычаіліся да сітуацыі, калі з'яўляюцца «адзінокай звышдзяржавай». Дзяліцца з Кітаем нічым не хочацца, але давядзецца ў сілу маштабу яго росту. У такой сітуацыі аднойчы стратэгам ЗША можа прыйсці ў галаву заблакіраваць марскія перавозкі сыравіны для Кітая, каб нагадаць яму, у каго ёсць бясспрэчная ваенная перавага на моры, і прытармазіць яго амбіцыі. Калі да таго часу выбудаваць хуткасную сетку чыгунак па Еўразіі, удар станецца не такім сур'ёзным — можна будзе арганізаваць падвоз часткі прыродных рэсурсаў, якія цяпер пастаўляюцца морам, па сушы.

Такім чынам, ініцыятыва «Адзін пояс — адзін шлях» сама па сабе не з'яўляецца выклікам дамінаванню ЗША, спараджаючы канфлікты, а нацэлена на рэалізацыю жыццёва важных інтарэсаў Кітая, перш за ўсё ў сферы эканомікі і бяспекі. Канфліктны патэнцыял з ЗША нарастае незалежна ад яе, у сілу самога факта рэзкага павелічэння патэнцыялу Кітая.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук, прафесар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

■ Тры пытанні да ўлады

БЫЦЬ ГАСПАДАРОМ ВА ЎСІМ

Хоцімскі раён лічыцца сельскагаспадарчым. Сёлета на абласных «Дажынках» ён быў адным з лідараў абласных спаборніцтваў за дасягненне высокіх паказчыкаў на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых, уступіўшы толькі такім моцным «сапернікам», як Шклоўскі і Магілёўскі раёны. Наколькі дынамічна развіваецца раён па астатніх кірунках, які ў яго патэнцыял — пра гэта і іншае ў размове са старшынёй Хоцімскага райвыканкама Дзмітрыем РУБАНАМ. Сёлета ён узначаліў раённую вертыкаль, а да гэтага плённа працаваў на пасадзе намесніка старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама.

— Дзмітрый Міхайлавіч, на пасадзе кіраўніка раёна вы толькі некалькі месяцаў, але, напэўна, ужо вызначыліся, у якім кірунку раёну трэба развівацца?

— Трэба займацца развіццём малога і сярэдняга бізнесу, прыцягваць інвестыцыі, утрымліваць і паляпшаць пазіцыі ў сельскай гаспадарцы. Сёлета раён прадэманстраваў дастаткова нядрэнны вынік. Дыплом за трэцяе месца ў абласных спаборніцтвах — вельмі вялікі гонар і адказнасць. Пакуль мне складана характарызаваць тыя паказчыкі, якія склаліся да мяне. Але я магу казаць пра тое, як Хоцімшчына плануе развівацца ў будучым. Раён знаходзіцца не на апошнім месцы па вытворчасці малака, і першая яго задача — захаваць і палепшыць сённяшнія пазіцыі. Патэнцыял ёсць, спецыялісты таксама. Тут усё залежыць толькі ад нас самих. Палепшым пазіцыі, стане прасцей рухацца наперад. Будуць і працоўныя месцы, і заробак. Ад работы сельгаспрадпрыемстваў залежыць эканоміка раёна, а значыць, яго далейшае развіццё і падтрымманне сацыяльнай сферы — аховы здароўя, адукацыі, культуры. Ёсць свае плюсы і ў тым, што раён мяжуе з Расіяй. І над гэтым мы таксама будзем працаваць.

— Акрамя работы і годнага заробку, людзей заўсёды хвалююць праблемы камунальнага характару — будаўніцтва і ўтрыманне жылля, якасныя паслугі. Як вырашаюцца ў Хоцімскім раёне гэтыя пытанні?

— У раёне ёсць людзі, якія маюць патрэбу ў жыллі, але сёлета тут нічога не будавалася. Плануем у наступным годзе пачаць будаўніцтва шматкватэрнага дома. Хто будзе гэтым займацца, вызначыцца падчас правядзення тэндара. Трэба, каб было якасна і нядорага. Хачу пры гэтым адзначыць, што хоцімская ПМК-276 пад кіраўніцтвам Міхаіла Кошкіна годна вырашае тыя праблемы, з якімі сутыкаюцца сёння ўсё будаўнікі. Кіраўнік арганізоўвае работу так, што сярэдняя заработная плата не ніжэй, чым у іншых арганізацыях. І нягледзячы на тое, што ў Хоцімскім раёне сёлета будаўніцтва не было, ПМК знайшла работу ў Краснапольскім раёне — выйграла тэндар па будаўніцтве шматкватэрнага жылога дома. Гэта гаворыць пра тое, што ў Хоцімску ёсць прадпрыемства, якое можа паспяхова весці будаўніцтва.

Настрой людзей сапраўды наўпрост залежыць ад якасці выканання камунальных паслуг. За перыяд, што тут працую, асаблівых заўваг да хоцімскага Жылкамгаса ў мяне не было. Да ацяпляльнага сезона аб'екты былі своечасова падрыхтаваныя. Задачы па падрыхтоўцы кацельных, жылля выкананы. Неабходны аб'ём работ па замене цепласетак — таксама. Цеплатрасы ў Хоцімскім раёне заменены на пі-трубу, якая зніжае страты ў цеплавых сетках. Але ёсць страты па водазабеспячэнні і прэтэнзіі да якасці вады, і з гэтымі недахопамі трэба працаваць.

У цэлым Хоцімск вельмі сімпатычны, утульны гарадок. Трэба падтрымліваць чысціню і парадак, якія ёсць, і, улічваючы пажаданні насельніцтва і тое фінансаванне, якое маецца, займацца добраўпарадкаваннем дваравых тэрыторый. Гэта той мінімум, які неабходна стварыць для камфорту людзей.

— Буйныя гандлёвыя сеткавікі абмінаюць Хоцімск. Вы, як новы кіраўнік, збіраецеся тут нешта змяніць?

— Сапраўды, у Хоцімску няма буйных гандлёвых прадпрыемстваў, горад і раён цалкам абслугоўвае райспажыўкааперацыя. Улічваючы тое, што ў іх няма канкурэнтаў, я даў даручэнне нашым ідэолагам правесці апытанне насельніцтва наконт таго, якім яны бачаць у будучым работу райспажыўкааперацыі. Праблемы, прапановы жыхароў — усё будзе ўлічвацца. Арганізуем работу так, як пажадае насельніцтва.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Мінск падтрымлівае ўзровень аднаго з самых спартыўных гарадоў свету

Зборная Еўропы супраць зборнай ЗША. Лёгкаатлетычная бітва пройдзе ў Беларусі

У свеце спорту такая падзея адбудзецца ўпершыню, а прыме яе сталіца 9—10 верасня 2019 года. Спаборніцтвы пройдуць на абноўленым стадыёне «Дынама». Ён будзе адпавядаць усім патрабаванням спартыўнага аб'екта, які можа прымаць чэмпіянаты свету і Еўропы па лёгкай атлетыцы. Ідэя правядзення міжнароднага матча Еўропа — ЗША належыць прэзідэнту Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свену Арнэ Хансэну. Падтрымку ў правядзенні гэтай спартыўнай падзеі ў сталіцы Беларусі выказаў і кіраўнік дзяржавы, Прэзідэнт НАК Аляксандр Лукашэнка.

Спадар Хансэн адзначыў, што ўражаны развіццём Беларусі ў сферы спорту, таму, калі выбіраўся горад, у якім пройдзе матч, вялікіх сумненняў не было, хоць на званне гаспадароў турніру прэтэндавалі такія буйныя гарады, як Лондан і Осла.

— Мінск — гэта схаваная жамчужына Еўропы. Многія людзі не ведаюць нічога пра гэты горад, а па прыездзе сюды дзівяцца, наколькі ён надзвычайны і прыгожы. Я ўпэўнены, што гэты матч дапаможа развіццю спартыўнага турызму вашай краіны. Ён пройдзе ў 2019-м невыпадкова, на сусветнай арэне ў лёгкай атлетыцы ў гэты год не шмат буйных лёгкаатлетычных спаборніцтваў. Чэмпіянат свету пройдзе ў Катары, таму нам хацелася б прывезці штосьці і ў Еўропу, — расказвае Хансэн. *— Гэтыя даты выбраны таксама невыпадкова, мы шмат думалі над імі, амерыканскія спартсмены таксама настойвалі менавіта на гэтым часе. На турніры будуць прадстаўлены ўсе віды бегу да 3 тысяч метраў, усе віды кідання і скачкоў. Таксама пройдуць эстафеты, якія, хутчэй за ўсё, будуць змяшанымі, бо на Алімпіядзе ў Токіа эстафеты будуць менавіта такія. Мы хочам максімальна запоўніць стадыён «Дынама» гледачамі, таму паспрабуем, каб у матчы прынялі ўдзел максімум беларускіх атлетаў, са свайго арганізатарскага вопыту ведаю, што стадыён запоўніцца толькі ў тым выпадку, калі будуць прадстаўлены мясцовыя спартсмены,* — паведаміў прэзідэнт Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі.

Плануецца, што ў кожным відзе праграмы спаборніцтваў будуць прадстаўлены па чатыры атлеты з каманды Еўропы і каманды ЗША. Усяго ўдзел у матчы прымуць 72 жанчыны і 72 мужчыны, плюс эстафетныя каманды. Адбор будзе будавацца на аснове камандных спаборніцтваў, якія пройдуць у 2019 годзе. Усе дэталі кваліфікацыі, бюджэту лёгкаатлетычнага турніру, сумы прызавых будуць вядомыя, калі спартыўныя функцыянеры падпішуць кантракт. Чакаецца, што гэта адбудзецца ў красавіку наступнага года.

Міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр ШАМКО адзначыў, што для нашай краіны гэта будзе чарговая буйная падзея сусветнага маштабу.

— Лёгкаатлетычныя спаборніцтвы адны з самых папулярных у свеце, яны заўсёды збіраюць поўныя стадыёны. За апошнія 5 гадоў мы практычна ў тры разы павялічылі колькасць сусветных спартыўных форумаў, якія праводзяцца ў Беларусі, — ад 25 у 2012 годзе да практычна 80 да 2018-га. Гэта паказчык прызнання нашай краіны на сусветнай спартыўнай арэне, паказчык добрага ўзроўню інфраструктуры, транспартных зносін, гасцінічнага бізнесу, — падкрэсліў Аляксандр Ігаравіч.

Старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ ў сваю чаргу адзначыў, што для айчынных спартсменаў гэты турнір стане добрай матывацыяй выступаць паспяхова, каб у 2019 годзе быць у топ-4 еўрапейскіх атлетаў і трапіць у зборную Еўропы.

— Матч у Мінску пройдзе за два тыдні да чэмпіянату свету ў Катары, для элітных лёгкаатлетаў ён стане генеральнай рэпетыцыяй планетарнага першынства, таму ў нас ёсць падставы разлічваць, што да нас прыедуць найлепшыя спартсмены свету. Прыемна, што сёння мы маем такі высокі ўзровень даверу. Жыхары нашай краіны любяць спорт, умеюць хварэць, гэта мы бачылі нядаўна ў тэнісным Кубку Федэрацыі, камандным чэмпіянаце Еўропы ў бегу на 10 тысяч метраў, таму такая падзея стане добрым штуршком для развіцця лёгкай атлетыкі ў Беларусі, — адзначыў Дзевятоўскі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Фінансы

ЖАДАЮ ПАСКАРДЗІЦЦА НА... МІНІКРЭДЫТ

Цяпер усе фінансавыя арганізацыі будуць весці кнігу заўваг і прапаноў

А даваць такую кнігу будуць па патрабаванні кліентаў у месцах заключэння дагавораў мікрапазыкі і ажыццяўлення лізінгавай дзейнасці. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 4 лістапада 2017 года №831, якая ўступае ў сілу з 11 лютага 2018 года.

Пастанова прынята з мэтай узмацнення абароны правоў і законных інтарэсаў кліентаў мікрафінансавых і лізінгавых арганізацый, павышэння якасці паслуг і паляпшэння работы са зваротамі грамадзян. Зараз мікрафінансавыя структуры ў адпаведнасці з Законам Беларусі «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» абавязаны даць кнігу заўваг і прапаноў па першым патрабаванні заяўніка і накіраваць яму адказ па сутнасці выказаных заўваг і прапаноў адносна якасці паслуг. З актуальным пералікам і адрасамі дзеючых мікрафінансавых і лізінгавых арганізацый можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Нацыянальнага банка ў раздзеле «Фінансавы сектар».

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ З нагоды

КАМУ ДАСТАНЕЦЦА МІКРАФОН?

Наваполацкі конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-Хало» сёлета пройдзе ў міжнародным фармаце. І арганізатары ганарацца тым, што ў горад нафтаперапрацоўшчыкаў пажадалі прыехаць хлопчыкі і дзяўчаткі з Беларусі, Расіі, Малдовы, Эстоніі, Украіны, Латвіі і Румыніі.

Як паведамілі ў гарвыканкаме, падзея адбудзецца 18—19 лістапада. Сярод членаў інтэрнацыянальнага журы мастацтва педагогі вакальнага майстэрства, кампазітары і дзеячы мастацтваў. А старшынства даверылі заслужанай артыстцы Рэспублікі Беларусь Ірыне Дарафеевай. У «суддзяў» нялёгкая задача: прыкладна з 60 канкурсантаў трэба будзе (у трох узроставых катэгорыях) выбраць найлепшых выканаўцаў. Ды яшчэ вызначыць, каму дастанецца галоўны прыз — прафесійны мікрафон, вельмі неабходны «аксесуар» для далейшага пакарэння творчага алімпа. Але, падкрэслілі ў аргкамітэце, усе юныя таленты атрымаюць памятныя прызы і сувеніры.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У Зімбабвэ ваенныя ўзялі пад кантроль будынак тэлевяшчальнай карпарацыі

Армія Зімбабвэ ўзяла пад кантроль будынак дзяржаўнай тэлевяшчальнай карпарацыі ў сталіцы краіны Харарэ, адхіліўшы пры гэтым паведамленні аб дзяржаўным перавароце. Узброеныя салдаты занялі і цэнтр горада, дзе былі чуваць выбухі.

Стрэлы былі чутны каля рэзідэнцыі 93-гадовага прэзідэнта краіны Роберта Мугабэ. Пры гэтым вайскоўцы запэўніваюць, што прэзідэнт у бяспецы, а іх мэта — «заклікаць да адказнасці злачынцаў вакол яго». Ваенныя актывізаваліся пасля таго, як кіруючая партыя «Афрыканскі нацыянальны саюз Зімбабвэ—Патрыятычны фронт» абвінаваціла ў здрадзе і падбухторванні да мяцяжу камандуючага ўзброенымі сіламі краіны Канстанціна Чывенгу. Раней той заявіў пра гатоўнасць умяшацца, каб спыніць ганенні на прыхільнікаў адхіленага 6 лістапада віцэ-прэзідэнта Эмерсана Мнангагвы.

Пазней стала вядома, што ваенныя ўсё ж змясцілі пад варту прэзідэнта краіны Роберта Мугабэ, які фактычна кіраваў рэспублікай з 1980 года, і яго жонку Грэйс. Пра гэта паведамляе Associated Press. Мясцовае выданне News 24 са спасылкай на неназваныя крыніцы паведамляе, што Мугабэ дамовіўся пра тое, каб яго жонка пакінула краіну, пакуль ён «рыхтуецца сысці ў адстаўку».

Больш за палову амерыканцаў лічаць, што Трамп не падыходзіць на пасаду прэзідэнта

Пра гэта сведчаць апублікаваныя вынікі новага сацыялагічнага апытання, арганізаванага Квініпэкскім універсітэтам у штаце Канэктыкут.

Згодна з распаўсюджанай інфармацыяй, 57% апытаных лічаць Трампа непрыдатным для вышэйшага дзяржаўнага паста, а 40% мяркуюць, што ён добра спраўляецца са сваёй дзейнасцю на пасадзе кіраўніка амерыканскай адміністрацыі. Як адзначаюць сацыёлагі, гэта самы мінімальны з адпаведных паказчыкаў сярод усіх апытанняў з моманту інаўгурацыі Трампа ў студзені сёлета.

59% апытаных мяркуюць, што Трампу не хапае неабходных лідарскіх якасцяў. 65% удзельнікаў апытання заявілі, што не лічаць Трампа ўраўнаважаным чалавекам. Акрамя таго, 62% рэспандэнтаў сцвярджаюць, што кіраўнік Белага дома не падзяляе каштоўнасці большасці амерыканцаў. Разам з тым 58% лічаць, што Трамп з'яўляецца моцнай асобай (39% мяркуюць інакш). Каля 55% рэспандэнтаў таксама лічаць прэзідэнта разумным чалавекам (не згодныя з гэтым 41% удзельнікаў апытання).

Ураган «Харві» прызналі біблейскім штормам

Ураган «Харві», які прайшоўся ў канцы жніўня па ўзбярэжжы амерыканскага штата Тэхас, прызналі біблейскім штормам. Пра гэта ў часопісе PNAS піша кліматолаг з Масачусецкага тэхналагічнага інстытута Кэры Эмануэль.

«Харві» стаў біблейскім ураганам у тым сэнсе, што нешта падобнае адбылося толькі аднойчы з тых часоў, як быў напісаны Стары Запавет», — тлумачыць ён. Вучоны стварыў кліматычную мадэль, якая разлічвае верагоднасць з'яўлення такіх ураганаў, як «Харві», у будучыні, а таксама частату іх узнікнення ў мінулым. На звестках вучонага, раней штормы такой сілы ўзнікалі раз у дзве тысячы гадоў. У найноўшы час такія ўраганы сталі прыходзіць часцей з-за кліматычных змен.

«Харві», які абрынуўся на ЗША, стаў самым разбуральным ураганам пасля «Катрыны» ў 2005 годзе, падчас штурму загінулі 80 чалавек.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Каб не тануць — вучыцца плаваць

Хлопчык, які тануў у сталіцы ў Свіслачы, адчувае сябе добра, паведамілі прадстаўнікі 2-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы.

Нагадаем, здарэнне адбылося 28 кастрычніка ў раёне вуліцы Даўмана. 9-гадовага хлопчыка выратаваў выпадковы мінак Віталь Цітоў. За свой учынак ён быў потым ушанаваны на розных узроўнях. Выратаванага перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі без дыхання і сэрцабіцця. Медыкі змаглі запусціць сэрца дзіцяці. У медустанове яго падключылі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, і ён быў у стане медыкаментознага сну. Апошнім часам пацярпелы знаходзіўся ў кардыялагічным аддзяленні бальніцы. Ён паспеў цалкам аднавіцца, настрой у маленькага пацыента добры, хлопчык з нецярплівасцю чакаў выпіскі дадому. Учора яго павінна была забраць маці. Дарэчы, дагэтуль маленькаму пацыенту абяцалі бясплатны абанемент у басейн. Была і сустрэча ратавальніка з выратаваным.

Грузавік «наскочыў» на цягнік

Пры сутыкненні цягніка Масква—Гомель і грузавога аўтамабіля ў Падмаскоўі ніхто не пацярпеў, паведаміла прэс-служба Маскоўскай чыгункі.

Здарэнне адбылося адразу пасля 22 гадзін на рэгуляваным чыгуначным пераездзе 37-га кіламетра перагона Адзінцова—Галіцына Беларускага напрамку Маскоўскай чыгункі. Кіроўца грузавога аўтамабіля выехаў на пуці і сутыкнуўся з надыходзячым цягніком №55 Масква—Гомель. Паводле папярэдняй інфармацыі, ніхто не пацярпеў. Пасажыры цягніка па медыцынскую дапамогу не звярталіся. З-за ДТЗ адбылася затрымка цягнікоў №1 Масква—Мінск і №3 Масква—Брэст.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Застолле — каханне — забойства

Проста мексіканскія страсці разгарэліся на адным з падворкаў вёскі Плотніца Столінскага раёна.

Дзве жанчыны, як іх называлі, сяброўкі, без асаблівай прычыны, проста, каб парадаваць душу, зладзілі пікнічок на прыродзе. Справа была летам, таму разаслалі пакрывала пад яблыняй, сабралі гарэлкі і закускі, паклікалі мужчын: мужа 50-гадовай і сужыцеля 33-гадовай. За выпіўкай час праходзіў хутка, але старэйшая ўспомніла, што ў яе ёсць гаспадарка, ды пайшла дадому пакарміць коз, курэй, качак. А калі вярнулася, то застала нечаканую карціну: яе «сяброўка» была не толькі без адзення, але і ў абдымках мужа, не свайго, вядома.

Тады пакрыўджаная маці сямейства, бабуля ўнукаў стала лупцаваць і мужа, і сапернiцу. Збіла маладую на горкі яблык падручнымі сродкамі ды пагнала законнага дахаты. Як высветлілася потым, пацярпелая праляжала ўсю ноч на зямлі голая. Да шматлікіх траўмаў дабавілася пераахаладжэнне. Адным словам, 33-гадовая жанчына памерла праз суткі ў бальніцы. Старэйшай суд прызначыў сем гадоў пазбаўлення волі. На судзе яна прасіла спагады, гаварыла, што зусім не думала пра забойства. А варта было б падумаць хоць пра тое, што будуць адказваць яе дзеці ўнукам на пытанне, чаму бабуля ў турме.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«Мабільны» падман

Па падазрэнні ў махлярстве ў сталіцы праваахоўнікамі затрыманы 37-гадовы мінчанін.

Згодна з інфармацыяй Фрунзенскага РУУС г. Мінска, у міліцыю звярнуліся грамадзяне, якія расказалі, што невядомы мужчына праз аб'явы ў інтэрнэце прапаноўваў ім набыць мабільныя тэлефоны па сярэднярыначных цэнах. Пасля перакідвання грошай на рахунак «прадаўца» жаданы тавар пакупнікі так і не атрымлівалі. У твар зламысніка ніхто з пацярпелых не бачыў, сувязь падтрымлівалася толькі праз перапіску ў сецівe. Міліцыянеры ўстанавілі, што выкарыстоўваў такую «рэкламу» толькі як нагоду для выманьвання чужых грошай. Падобным чынам падазраваны «развёў» каля 30 грамадзян. Проціпраўнай дзейнасцю мужчына займаўся ў 2016—2017 гадах: некаторыя кліенты чакалі абяцаныя тэлефоны больш за год. Адгаворкі знаходзіліся самыя розныя: няма тавару на складзе, прывезлі няспраўныя тэлефоны і г. д.

Мужчыну пагражае пазбаўленне волі на тэрмін да 10 гадоў. Дарэчы, раней ён працаваў дырэктарам прадпрыемства, якое займалася заточкай станкоў, прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за падробку дакументаў, за парушэнне ПДР, якое пацягнула цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЯСЁЛКА Ў ЛІСТАПАДЗЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Убачыўшы гэты вясёлы дом у вёсцы Плянта Салігорскага раёна, адразу ўспомніў дзіцячую цацку — калейдаскоп: паглядзіш у шкляное акенца — а там якога толькі дзіва няма: і зорачкі, і ромбікі, і кветачкі. Вось і гэтая вясковая пабудова з ярка выражанай мазаікай на фасадзе нагадвае вясёлку на фоне шэрага лістападаўскага неба! Казка! Як тут не спыніцца?!

Заінтрыгаваны, хапаю фотакамеру, углядаюся ў выразны рытм сініх, белых і чырвоных ліній, «чытаю» маляўнічую кветкавую паляну на франтоне. Толькі цяпер даходзіць, што перада мною — ілюзія: замест алейных фарбаў выкарыстаны накрыўкі ад пластыкавых бутэлек. Аказваецца, такая звычайная рэч можа стаць выразным сродкам і выявіць мастакоўскія і дызайнерскія здольнасці. Згадзіцеся, у немудрагелістым, на першы погляд, сюжэце прасочваецца і дасканалая кампазіцыя, і бездакорная сіметрыя, і валоданне колерам і гамай. Хацеў бы я ведаць, хто гэты творца. Не сумняваюся, ён — сапраўдны рамантык і проста жыццярадасны чалавек!

А вось гаспадар і сам выходзіць на ганак — усмешлівы, прыветлівы, як і яго дом. Запрашае ў двор, прадстаўляецца: «Рыф Зуфаравіч Сібагатулін, але для ўсіх проста Раман».

З маленькага інтэрв'ю я дазнаюся, што Раман з Башкірыі, яму шэсцьдзясят тры гады, у Беларусі жыве з 1978 года. А па прафесіі — нафтавік, бурыў скважыны. Апошнія дзесяць гадоў жыве ў вёсцы, перад пенсіяй працаваў у Салігорскай ЖКГ. На гэтай пасадзе і «захварэў» збіраннем накрывак.

— Я даўно выношваў ідэю, каб рознакаляровымі накрыўкамі аздобіць фасад свайго дома, — кажа Раман. — Тры гады збіраў калекцыю, а гэта амаль трынаццаць тысяч штук. Работа ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы дапамагала. Гэтай колькасці накрывак хапіла на ўзоры паміж вокнамі, на вуглы, на франтон і агароджу кветніка.

Сваё дызайнерскае рамяство Раман практыкуе зімой. На фанерныя лісты наносіць эскіз, дакладна вымярае прастору і шрубавёртам прымацоўвае накрыўкі (гэта ж колькі трэба шрубаў?!). Сіметрыя павінна быць ідэальная. Потым гатовую мазаіку прыбівае да сцяны дома. І гэтак ад зімы да зімы, з году ў год. Тры зімы спатрэбілася, каб нарэшце на фасадзе з'явіўся выразны малюнак, падобны на арнамент. Але работа яшчэ не скончана, таму Раман будуе планы і на гэтую, і на будучую зіму. А таму па-ранейшаму збірае галоўны матэрыял для свайго праекта — бутэлечныя накрыўкі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Чулі?!

Заказнік з унікальнымі ландшафтамі

І месца жыхарства чырванакніжнікаў

Рэспубліканскі водна-балотны заказнік «Слаўгарадскі» абвешчаны ў Слаўгарадскім раёне Магілёўскай вобласці ў мэтах захавання ў натуральным стане каштоўнага прыроднага пойменнага і лесабалотнага комплексу, дзе ёсць дзікарослыя расліны і дзікія віды жывёл, уключаныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з наяўнасцю на тэрыторыі заказніка ўнікальных ландшафтаў з высокай эстэтычнай і пейзажнай каштоўнасцю яго трэба разглядаць як перспектыўную рэкрэацыйную зону, паведамілі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У склад тэрыторыі заказніка ўвайшлі землі лясного фонду дзяржаўнай лесагаспадарчай установы «Краснапольскі лясгас», землі сельскагаспадарчага прызначэння і землі запасу. Яго плошча — 14 779,33 гектара. Асноўай заказніка стаў пойменны лесабалотны комплекс, які фарміруе гідралагічныя рэжымы тэрыторыі заказніка і рэк Сож і Проня. Участкі поймы гэтых рэк, у межах якіх ствараецца заказнік, маюць вялікае значэнне для захавання месца жыхарства каляводна-балотных і прыбярэжна-водных відаў птушак на ўсходзе Беларусі. У красавіку-маі тут спыняецца больш за 20 тысяч гусей і каля 30 тысяч кулікоў, самыя шматлікія з якіх — белалобая гусь і турухтан, больш за 500 асобін шэрых журавлёў і інш. Тэрыторыя заказніка служыць месцам жыхарства 5 рэдкіх і знікаючых відаў дзікарослых раслін і 11 відаў дзікіх жывёл, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

	30.09.2017 (неаудировано)	31.12.2016
Активы		
Денежные средства и их эквиваленты	523 067	437 088
Драгоценные металлы	521	551
Средства в кредитных организациях	54 975	38 592
Кредиты клиентам	2 676 252	2 385 393
Инвестиционные ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи	526 387	824 439
Инвестиции в ассоциированную компанию	3 916	3 915
Основные средства	148 591	151 197
Активы, построенные для продажи	9 412	13 236
Инвестиционная недвижимость	3 769	5 291
Нематериальные активы	33 943	39 636
Текущий актив по налогу на прибыль	16	762
Отложенные активы по налогу на прибыль	8 139	6 441
Прочие активы	30 750	44 487
Итого активы	**4 019 738**	**3 951 028**
Обязательства		
Средства кредитных организаций	1 064 236	1 358 520
Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь	8 809	12 739
Средства клиентов	2 129 668	1 892 433
Выпущенные долговые ценные бумаги	–	3 352
Текущие обязательства по налогу на прибыль	3 735	1 068
Отложенные обязательства по налогу на прибыль	1 119	887
Прочие обязательства	127 229	24 772
Субординированный кредит	199 367	196 607
Итого обязательства	**3 534 163**	**3 490 378**
Капитал		
Уставный капитал	473 057	473 057
Эмиссионный доход	458	458
Дополнительный капитал	5 485	5 485
Фонд переоценки зданий	23 140	23 390
Нереализованная переоценка инвестиционных ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи	18 942	–
Накопленный дефицит	(44 412)	(51 141)
Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка	**476 670**	**451 249**
Неконтрольные доли участия	8 905	9 401
Итого капитал	**485 575**	**460 650**
Итого капитал и обязательства	**4 019 738**	**3 951 028**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ОАО «Банк БелВЭБ»

за период, закончившийся 30 сентября 2017 года

(в тысячах белорусских рублей)

	За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2017 (неаудировано)	За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2016 (неаудировано)
Процентные доходы		
Кредиты клиентам	226 054	276 517
Инвестиционные ценные бумаги	42 052	43 594
Средства в кредитных организациях	1 977	2 923
Финансовая аренда	70	161
	270 153	**323 195**
Процентные расходы		
Средства кредитных организаций	(58 655)	(76 704)
Средства клиентов	(62 959)	(66 368)
Субординированный кредит	(10 146)	(9 097)
Выпущенные долговые ценные бумаги	(569)	(635)
	(132 329)	**(152 804)**
Чистый процентный доход	**137 824**	**170 391**
Резерв под обесценение кредитов	(89 913)	(78 370)
Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты	(646)	(894)
Чистый процентный доход после резерва под обесценение кредитов	**47 265**	**91 127**
Чистые комиссионные доходы	**40 686**	**39 344**
Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте:		
– торговые операции	21 308	20 256
– операции с производными финансовыми инструментами	(151)	86
– переоценка валютных статей	13	2 932
Доля в чистой прибыли/(убытке) ассоциированной компании	1	(166)
Финансовый результат от выбытия дочерней компании	1 036	–
Прочие доходы	29 243	18 204
Непроцентные доходы	**92 136**	**80 656**
Расходы на персонал	(47 156)	(44 669)
Амортизация	(16 310)	(12 090)
Налоги кроме налога на прибыль	(2 709)	(2 403)
Прочие операционные расходы	(45 850)	(42 031)
Прочие расходы от обесценения и создания резервов	(1 674)	(95)
Непроцентные расходы	**(113 699)**	**(101 288)**
Прибыль до налога на прибыль	**25 702**	**70 495**
Налог на прибыль	(8 216)	(8 877)
Прибыль за отчетный период	**17 486**	**61 618**
Приходящиеся на:		
– акционеров Банка	**16 118**	**60 195**
– неконтрольные доли участия	1 368	1 423

Председатель Правления банка **Н.В. Лузгин**

Заместитель главного бухгалтера **Н.А. Выхота**

Дата подписания: 9 ноября 2017 года

Консолидированная бухгалтерская (финансовая) отчетность, составленная в соответствии с требованиями МСФО, размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2017 год».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078

У ПОШУКАХ САПРАЎДНАГА

ВЕЛАСІПЕД З «МАТОРЧЫКАМ»

На прыпынку нас сустракае Кірыл. У чырвона-зялёным спартыўным касцюме з надпісам «Belarus» і на веласіпедзе, «запрэжаным» сабакамі.

— Пакатацца не хочаце?

Мы з фатографам вагаемся. А маламутам карціць сарвацца з месца. Умка завывае: маўляў, рашайцеся хутчэй. І сапраўды, калі яшчэ такі шанц выпадзе?

...Дамы ў вёсцы Горная Рута стаяць паасобку, як хутары. На палях яшчэ не рассеяўся ранішні туман. Збочыўшы з дарогі, заўважаем Таццяну ў кампаніі шчанюкоў. Тым усяго толькі чатыры месяцы, а ўжо вымахалі гаспадыні да калена. Здалёк можна падумаць, што з лесу выбегла зграя ваўкоў.

— Быў у нас адзін выпадак. Сусед на кані ехаў, а той заўважыў у пачатку вёскі Умку. Стаў на дыбы і ледзь назад не паскакаў, — расказвае сям'я.

Пасля прабежкі ў шчанюкоў сняданак. Усе чацвёра забягаюць у вальер, садзяцца ў радочак, быццам першакласнікі, і цярпліва чакаюць, пакуль Кірыл па чарзе разложыць порцыі. Але есці ніхто не пачынае. І толькі пасля каманды «можна» дружна зарываюцца насамі ў корм і грукочуць міскамі.

— Ну што, пойдзем у дом?

МАРЫ АБ САДЗЕ І ЕЖЫ СА СВАЙГО АГАРОДА

У каміне патрэскваюць дровы. На стале — свойскія хлеб, тварожны сыр, варэнне. І самаробная духмяная гарбата — яблычная, з ноткамі чабору і сасны. Таццяна і Кірыл расказваюць, як сустрэліся дзякуючы вёсцы. А да гэтага ў кожнага было сваё сталічнае жыццё.

У дарослых маламутаў рэгулярныя трэніроўкі — прабягаюць з Кірылам ад трох да дзесяці кіламетраў. Узімку на шпацыр адпраўляюцца штодня: гэта парода абажае марознае надвор'е.

Кірыл займаўся спортам — модным на той час атлетычнай гімнастыкай. У 1991 годзе стаў апошнім чэмпіёнам Савецкага Саюза па культурызме. Вёў бізнес у гэтай сферы — прадаваў спартыўнае харчаванне, аснашчаў фітнес-цэнтры трэнажорамі — і кіраваў Беларускай федэрацыяй бодзібілдынга і фітнесу. А ў 2011-м сабраўся і пераехаў у вёску.

— Што змянілася? — задумваецца. — Жыццёвыя каштоўнасці. Дзеці — тры дачкі — ужо выраслі, і я падумаў: што я яшчэ павінен зрабіць, каб не было крыўдна за пражытыя гады? Хацелася нечага большага, чым проста траціць і запасіць. Хоць я далёка не аграрый, даўно марыў пра ежу са свайго агарода і прыгожы сад з пладовымі дрэвамі.

Таццяна ўсё сваё дзяцінства праводзіла летнія канікулы ў вёсцы. Нават калі выбірала прафесію — па першай адукацыі яна настаўнік пачатковых класаў, — думала: як здорава — лета не ў горадзе. А пасля з галавой паглыбілася ў работу. Больш за чатыры гады жыла ў Маскве: працавала там чайным майстрам, рэдактарам кніг, вяла псіхалагічныя трэнінгі.

— Калі вярнулася ў Беларусь, было ўжо адчуванне перасыці сацыяльнымі дасягненнямі, — дзеліцца Таццяна. — Я купіла домік у глыбінцы на мяжы з Літвой. Сапраўдная глуш. Мясцовыя глядзелі на мяне як на вар'ятку: маўляў, так не можа быць, каб дарослы забяспечаны чалавек выбраў лес замест гіпермаркета і печку замест саўны. Пражыўшы там практычна год, я зноў прыехала ў Мінск і адкрыла сваю справу — у мяне была чайная школа: я вяла цырымоніі, запусціла інтэрнэт-краму. Але вывучаючы культуру Усходу, усё больш імкнулася да прыроды, размеранага ладу жыцця. Каб весці бізнес, наняла памочнікаў, а сама большую частку часу праводзіла ў тым доміку на паўночным захадзе Беларусі.

Пазнаёмілася пара шэсць гадоў таму ў гасцях у агульнай сяброўкі, якая жыве ў вёсцы непадалёк. Кірылу тады запала ў душу і Таццяна, і гэтая мясцовасць.

— Я ўбачыў дубы, ручай. Сеў на лаўку, прыслухаўся, удыхнуў паветра. Усё вакол загаласіла: «Так, так!» — успамінае ён. — Прыехаў у Мінск — не магу. Тыдзень вытрымаў і вярнуўся сюды. Купіў дом і застаўся.

А праз год Таццяна прадала бізнес і пераехала да яго. «У вёсцы мы шмат гісторый пра сябе чулі. Напрыклад, што Кірыл — палкоўнік КДБ у адстаўцы, а дарожкі да нашага дома выкладзены чырвонай цэглай», — смяюцца.

«МЫ ЯК ЛУНАЦІКІ ТУТ»

Сям'я прызнаецца: калі пераехалі, не ведалі за што хапацца. Увагі патрабаваў і дом, і ўчастак. Хату Кірыл абшыў і ўцяпліў. Заняўся ўнутраным аздабленнем. Падлога, печ, ложкі, крэслы — усё зроблена сваімі рукамі. Калі быў патрэбны посуд, Таццяна наляпіла талерак і кубкаў з гліны, неабходны фіранкі — асвоіла пэчварк (шыццё з абрэзкаў тканіны).

Дубковы заняліся прыродазгодным земляробствам — яго сутнасць у тым, каб не пераадольваць прыроду, а вывучаць яе заканамернасці і падстройвацца пад іх. Зямлю яны не араць, толькі зверху ўзрыхляюць, замест пестыцыдаў выкарыстоўваюць арганічныя ўгнаенні — гной, гумус.

«Дзеці — тры дачкі — ужо выраслі, і я падумаў: што я яшчэ павінен зрабіць, каб не было крыўдна за пражытыя гады?»

— Ёсць расліны, якія ўзаемадапаўняюць адна адну, напрыклад цыбуля і морква, — іх трэба садзіць на адну градку: так яны будуць лепш змагацца з паразітамі, — тлумачыць Таццяна. — Гэта дазваляе менш фізічна ўкладвацца. Але першыя гады ідуць на тое, каб аднавіць урадлівы слой глебы, загублены хіміяй.

Яшчэ адзін прынцып прыродазгоднага земляробства — выварошчваць тое, што характэрна для дадзенай кліматычнай зоны. Кабачкі, гарбузы, пятрушку, бульбу... «Самае радаснае, што ў нас ранняй вясной шмат зеляніны на стале. Паснедаеш хлебам з маслам і з зелянінай — і гатовы шчыраваць увесь дзень», — кажа Кірыл.

Ад былых гаспадароў на ўчастку засталіся чатыры велізарныя чарэшні, пасаджаныя гадоў 50 таму. Ураджаю хапае ўсім: сябры сям'і ў сезон прыязджаюць — набіраюць па два вядры ягад.

— Летам штогод пашыраецца пералік дзікаросаў, якія мы ўжываем у ежу. Крапіва, дзьмухаўцы, снітка, лебяда, макрыца, каранi лопуху, — пералічае гаспадыня. — Інакш глядзіш на ўчастак. Калі першыя гады перажывала, як гэта ўсе прапалоць, скасіць, то цяпер: «О, і гэта можна з'есці».

Таццяна адзначае: у горадзе нікалі не заўважала, як светлавы дзень карацее, для яе гэта не мела ніякага значэння — уключыў святло і ўсё. А жывучы на зямлі, становішся больш залежным ад прыродных цыклаў.

— Трэба гарманічна ўзаемадзейнічаць з навакольлем, каб радасна жыць. А мы гэта страцілі ў свой час, — дадае Кірыл. — Таму мы як лунацікі тут.

Забароны на магазінныя прадукты ў пары няма. Іншая рэч, што з цягам часу ўсё менш хочацца нешта купляць у краме. «Я як пачытаю склад печыва, думаю: не, трэба ісці сваё аўсянае гатаваць», — смяецца Таццяна.

Як зарабляць у вёсцы? Кірыл асвоіў дрэваапрацоўку (нарыхтоўвае на заказ дошкі, брускі), ставіў цяпліцы. Таццяна вярстае і рэдагуе тэксты, лепіць посуд, ферментуе чаі — са скрыпеню, грушы, малін, ажын. «Даверыцца жыццю складана, — разважае яна. — Калі сцежкі пратаптаны, ты ведаеш, што ў панядзелак ідзеш на работу, у аўторак таксама і г. д. — так лягчэй. Але ў нейкі момант душа пачынае разрывацца. У вёсцы складаней у плане самадысцыпліны, арганізацыі свайго часу, але я не адчуваю, што ў нечым здраджваю сабе».

ТРЭНІРОЎКІ Ў МАРОЗ І СУСЕДСКІЯ КУРЫ

Маламуты з'явіліся адразу пасля пераезду. Кірылу быў патрэбны кампаньён, каб займацца фізкультурай, таму выбар прыпаў менавіта на гэту пароду. Спачатку завялі Умку, пасля — Асканню. А летам размераны лад жыцця парушылі шчанюкі. Таццяна з усмешкай успамінае: пару апошніх месяцаў, калі гадавалі ўсіх дзевяцярых, нагадвалі нейкі марафон.

Сям'я часта прагульваецца са шчанюкамі па вёсцы. У першыя месяцы жыцця сабакам трэба пазнаёміцца з як мага большай колькасцю людзей, гукаў, пахаў: гэта важна для іх адаптацыі. А ў дарослых маламутаў рэгулярныя трэніроўкі — прабягаюць з Кірылам ад трох да дзесяці кіламетраў. Узімку на шпацыр адпраўляюцца штодня: гэта парода абажае марознае надвор'е.

Бегаць у вупражы сабак прывучаюць з маленства. На шчаня надзяваецца шлейка, каб ён да яе прывыкаў. Потым прывязваецца лёгкі груз — напрыклад, бярвенца. Важна, каб сабака рухаўся рыссю. Праходзіць час — і ён сам пачынае выбягаць наперад. «А вы яго хваліце, — дадае Кірыл. — У нашых сабак галоўны матыватар бегчы — пахі звяроў і магчымасць сустрэць новых людзей. У маламутаў розныя характары: Умка «ірве» са двара, а Аскання — дадому».

— Чаму ў спаборніцтвах не ўдзельнічаеце?

— Сабакам гэта не патрэбна. А я свае спартыўныя амбіцыі ўжо рэалізаваў.

Па словах гаспадароў, карміць маламутаў не так складана, як здаецца. Дзённая порцыя для дарослага сабакі — паўкіло мяса (ці субпрадуктаў), крупы і агародніна. У месяц на харчаванне аднаго гадаванца ідзе каля ста рублёў.

— А суседскіх курэй не крадуць?

— Было аднойчы. Але нават добра выхаваны сабака, калі ён гуляе без нагляду чалавека, можа не ўтрымацца ад гэтага — інстынкты возьмуць верх.

Дарослыя маламуты дапамагаюць і па гаспадарцы: прыцягваюць бярвёны, камяні ў покрыўках. Неяк трэба было завезці дадому крынічную ваду, а джып зламаўся. Кірыл пагрузіў бочкі ў велізарныя сані, спрабаваў зрушыць сам — не змог. Запрэглі Умку — ён лёгка пацягнуў.

Маламуты, дарэчы, не адзіныя жывёлы ў гэтай сям'і. У доме разам з намі грэюцца малая Ніколь (сумесь таксы з карлікавым пінчарам), кошка Марфа і кот Ліс. Апошні нават не злез з печы, каб павітацца: праспаў увесь дзень.

— Як думаеце, чаму людзей, якія пераязджаюць з горада ў вёску, становіцца ўсё больш?

— Мне здаецца, гэта натуральная з'ява, — лічыць Таццяна. — Грамадства спажыўцоў дайшло да пікі, тэхналагічны свет ужо вычарпаў сваю прыцягальнасць, і людзі шукаюць штосьці сапраўднае. Я крыху зайздрошчу той моладзі, якая прыходзіць да гэтых высноў рана. У іх ёсць магчымасць і дом на прыродзе пабудаваць, і сям'ю тут стварыць.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Карэліцкі раён.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Чулі?!

Нас чакае «халоднае» Сонца

Ці прынясе яно малы ледніковы перыяд?

Колькасць плям на Сонцы, якія вызначаюць узровень сонечнай актыўнасці, імкліва падае. Гэта зафіксавалі спецыялісты лабараторыі рэнтгенаўскай астраноміі Сонца Фізічнага інстытута імя П. М. Лебедзева РАН (ФІАН).



Вынікі назіранняў расійскіх астрафізікаў паказалі, што сёння на звернутым да Зямлі баку Сонца не назіраецца ні адной плямы. Навукоўцы выказалі здагадку, што плямы могуць адсутнічаць і на адваротным баку зоркі: яны адзначылі, што не могуць дакладна сказаць, ці так гэта, але падкрэслілі, што на фотаздымках Сонца двухтыднёвай даўнасці плямы таксама адсутнічалі.

Кожныя 11 гадоў адзіная зорка Сонечнай сістэмы змяняе цыкл актыўнасці. Раз у 11 гадоў колькасць плям на Сонца дасягае максімуму, мінімум актыўнасці назіраецца ў зоркі прыкладна пасярэдзіне цыкла. Гэта з'ява атрымала назву цыкл Швабе. «Выходзячы з карціны, якую мы назіраем цяпер, Сонца няўхільна рухаецца да чарговага мінімуму, які будзе дасягнуты ў канцы 2018-га — першай палове 2019 года», — растлумачылі ў лабараторыі ФІАНа.

На працягу найбліжэйшага часу, дадалі астрафізікі, на Сонцы спачатку цалкам знікнуць складаныя групы плям і спыняцца ўспышкі. Пасля гэтага ў кароне сяўліца знікнуць вобласці гарачай плазмы, а энергія прадукаванага імі рэнтгенаўскага выпраменьвання знізіцца амаль да нуля. Паступова будуць спрашчацца пакінутыя сонечныя плямы, што на мінімуме актыўнасці прывядзе да падзення магнітнай энергіі зоркі да нуля. У такім выглядзе Сонца будзе заставацца ад некалькіх месяцаў да года, пасля чаго яго актыўнасць пачне паступова ўзрастаць і стартуе новы сонечны цыкл.

«У цяперашні момант Сонца, мяркуючы па ўсім, стала ўваходзіць у трэці этап, які характарызуецца паступовым знікненнем плям. На гэтым этапе ўсё яшчэ на кароткі час могуць з'яўляцца асобныя плямы і нават адбывацца слабыя ўспышкі, але гэта з'яўляецца толькі апошнімі ўсплёскамі актыўнасці. Канчатковае знікненне плям з Сонца можа адбыцца ўжо на працягу двух-трох наступных месяцаў», — заключылі астрафізікі ФІАНа.

Вядучы навуковы супрацоўнік Пулкаўскай абсерваторыі Георгій Ганчароў пацвердзіў, што сонечныя плямы сапраўды зніклі, аднак нічога экстраардынарнага ў такой сітуацыі няма. «Я магу сказаць, што перыяд мінімуму сонечнай актыўнасці сапраўды набліжаецца. Такое адбываецца, і плямы практычна знікаюць на некалькі месяцаў. У часы Пятра I былі мінімумы са знікненнем плям на некалькі гадоў», — расказаў Ганчароў.

Выхад з мінімуму сонечнай актыўнасці ў новую фазу, **як паказваюць назіранні, можа наступаць са спазненнем, з-за чаго адбываецца змяненне клімату на Зямлі. Так, на стыку XVII—XVIII стагоддзяў, у перыяд, які астрафізікі называюць малым ледніковым, быў зафіксаваны збой сонечнага цыкла — мінімум Маўндэра.** Сонечная актыўнасць замерла на некалькі дзесяцігоддзяў, і на працягу амаль 50 гадоў на Сонцы было ўсяго каля 50 плям замест звычайных 40—50 тысяч.

Галоўны навуковы супрацоўнік лабараторыі фізікі Сонца і касмічных прамянёў ФІАНа Сяргей Багачоў у размове адзначыў, што амаль поўнае знікненне плям кажа пра тое, што найбліжэйшы мінімум будзе вельмі глыбокі, «магчыма, нават экстрэмальна, і актыўнасць Сонца ўпадзе да вельмі нізкага ўзроўню».

Мінімум актыўнасці доўжыцца не вельмі доўга, у асноўным гэта займае перыяд у адзін год, таму Зямля не паспявае неяк адрэагаваць на гэтую падзею і прыкметных змен няма, але ў гісторыі былі выпадкі, калі Сонца ўваходзіла ў стан мінімуму і затрымлівалася ў ім на дзесяцігоддзе. Калі Сонца затрымліваецца ў стане мінімуму, назіраецца адчувальнае падзенне зямной тэмпературы на пяць-дзесяць градусаў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Не сезон

РАПУШКА — ПАД ЗАБАРОНАЙ

З 15 лістапада па 20 снежня ў рыбалоўных угоддзях Беларусі забаронена лоўля еўрапейскай рапушкі ў сувязі з яе нерастам.

Рапушка — самы дробны прадстаўнік сігавых відаў рыб, яе максімальная даўжыня — не больш за 25 сантыметраў, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету. Колькасць рапушкі невялікая і схільная да значных хістанняў, што звязана з кароткім жыццёвым цыклам і ўразлівасцю ікры ў працэсе інкубацыі і моладзі пры нагуле. З 1981 па 1993 год, а таксама з 2004-га па чэрвень 2014 года від знаходзіўся ў Чырвонай кнізе Рэспублікі Беларусь і быў забаронены да вылаву. Цяпер лавіць рапушку дазволена за выключэннем нерастаставага перыяду. За здабычу адной асобіны ў забаронены час парушальнікам давядзецца выплаціць 9 базавых велічынь (207 рублёў).

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Извещение о проведении 27 ноября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)		
Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
«склад масел и химикатов» общей площадью 400 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-59751, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, д.143 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)	28 900,00	2 800,00

Продавец имущества: ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 27 ноября 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 16.11.2017 по 23.11.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(0176) 74-72-04 (ОАО «Электромодуль»).

Отдел принудительного исполнения Дзержинского района Минской области объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ДУП «ПМК №190» УНП 690019034, расп. по адресу: г. Дзержинск, ул. Фрунзе, 2

ЛОТ 1. Капитальное строение (гараж , об. пл. 137,1 кв. м.,) и условного земельного участка с к/н 625650100002000255, пл. 0,0715 га, расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130 начальной продажной ценой 19 011,04 рублей (девятнадцать тысяч одиннадцать белорусских рублей четыре копейки).

ЛОТ 2. Капитальное строение (здание склада, общ. пл. 96,5 кв. м) и условного земельного участка, расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130Г/2 начальной продажной ценой 6 379,36 рублей (шесть тысяч триста семьдесят девять белорусских рублей тридцать шесть копеек).

ЛОТ 3. Капитальное строение (здание цеха сборного железобетона, общ. пл. 1407,1 кв. м) и условного земельного участка, расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130Г начальной продажной ценой 173 290,40 рублей (сто семьдесят три тысячи двести девяносто белорусских рублей сорок копеек).

ЛОТ 4. Капитальное строение (арматурная мастерская, общ. пл. 408,0 кв. м) и условного земельного участка, расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130/5 начальной продажной ценой 58 252,16 рублей (пятьдесят восемь тысяч двести пятьдесят два белорусских рубля шестнадцать копеек).

ЛОТ 5. Капитальное строение (склад, инв. №623/С-58051, общ. пл. 228,3 кв. м) расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130Е/1 начальной продажной ценой 21 673,60 рублей (двадцать одна тысяча шестьсот семьдесят три белорусских рубля шестьдесят копеек).

ЛОТ 6. Капитальное строение (гараж, инв. №623/С-58050, общ. пл. 240,0 кв. м) расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130Е/2 начальной продажной ценой 24 240,80 рублей (двадцать четыре тысячи двести сорок белорусских рублей восемьдесят копеек).

ЛОТ 7. Капитальное строение (столярно-плотницкая мастерская инв. №623/С-58052, общ. пл. 915,7 кв. м) расположенного по адресу: Минская область, Узденский район, г. Узда, ул. К. Маркса, 130Д начальной продажной ценой 96 442,40 рублей (девяносто шесть тысяч четыреста сорок два белорусских рубля сорок копеек).

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Торги состоятся 27 ноября 2017 года в 14.00 по адресу: г. Дзержинск, ул. Фурманова д. 3 (здание общежития). За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Васюк Я. В. тел.: (8 01716) 9-23-06, (8044) 529 28-42. Прием заявок для участия в торгах со всеми необходимыми документами заканчивается в срок до 27.11.2017 года. Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет отдела принудительного исполнения Дзержинского района

IBAN: BY16AKBB36420606003506000000, (BIC) БИК AKBBBY21500, ЦБУ №606 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Дзержинск, код 601, УНП 600013502

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги».

В суд Волковысского района Гродненской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующим Карповича Александра Николаевича, 5 сентября 1984 года рождения, уроженца г. п. Россь Волковысского района Гродненской области, зарегистрированного по адресу: г. п. Красносельский Волковысского района Гродненской области, ул. Строителей, д. 17, кв. 26, который в ноябре 2013 года ушел из дома своего дедушки в г. п. Россь Волковысского района Гродненской области и до сих пор его местонахождение неизвестно, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающим сведениями о местонахождении Карповича Александра Николаевича, сообщить суду в течение двух месяцев с момента публикации.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»22 декабря 2017 года проводит 16-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
174	Автошасси Урал-375АМ ш. 443531 дв. 542532 1985 г. *4 кат. 1 885 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	5 000,00	500,00
175	Автошасси Урал-375А ш. 353591 дв. 124995 1981 г. *4 кат. 2 146 км*	г. Береза в/ч 23324	5 000,00	500,00
176	гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108201040 дв. 783785 1982 г. *4 кат. 3 801,7 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	48 000,00	4 800,00
177	гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108505054 дв. 51583 1985 г. *4 кат. 9 640 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	50 000,00	5 000,00
178	гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108110044 дв. 510322 1981 г. *4 кат. 15 036 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	48 000,00	4 800,00
179	гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108310016 дв. 835389 1983 г. *4 кат. 20 586 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	48 000,00	4 800,00
180	гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 10Е8903011 дв. 8853931 1989 г. *4 кат. 7 069 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	48 000,00	4 800,00
181	гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108303010 дв. 928589 1983 г. *4 кат. 16 876 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	48 000,00	4 800,00
182	гусеничное шасси АТС-59 г ш. 113522525 дв. 668823Е 1980 г. *4 кат. 535 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	12 000,00	1 200,00
183	гусеничное шасси АТС-59 г ш. 11362442 дв. 7Z12105E 1981 г. *4 кат. 8 660 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	10 000,00	1 000,00
184	гусеничное шасси АТС-59 г ш. 11381221 дв. 7АВ0928Е 1982 г. *4 кат. 200 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	12 000,00	1 200,00
185	гусеничное шасси АТС-59 г ш. 11340847 дв. 7Х04104Е 1978 г. *4 кат. 3 252 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	11 000,00	1 100,00
186	гусеничное шасси АТС-59 г ш. 1136204 дв. 7Z1156E 1980 г. *4 кат. 333 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	12 000,00	1 200,00
187	гусеничное шасси АТС-59 г ш. 11370429 дв. 7Z1244E 1981 г. *4 кат. 4 751 км*	г. Старые Дороги в/ч 48668	11 000,00	1 100,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **22 декабря 2017 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **16.00 19 декабря 2017 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **22 декабря 2017 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY31BLBB30120101099370001001 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код BLBBBY2X, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 (RUR), в Центре банковских услуг №701, ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код BPSBBY2X, УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 05 41, факс (017) 398 05 41.**

АДПАЧЫНАК НА ЗАВОДЗЕ

Прамысловы турызм краіны цікавіць замежнікаў

Апошнія некалькі гадоў у Беларусі набірае папулярнасць такі кірунак, як прамысловы турызм. Найбуйнейшыя айчынныя кандытарскія, лікёра-гарэлачныя, машынабудаўнічыя прадпрыемствы адкрываюць свае дзверы для ўсіх ахвотных. Падчас экскурсіі турысты могуць азнаёміцца з гісторыяй прадпрыемстваў, убачыць, як вырабляецца прадукцыя, паўдзельнічаць у тэхналагічных працэсах. Акрамя таго, гэта добры спосаб дэманстрацыі сваіх магчымасцяў для замежных інвестараў, якія літаральна могуць усё ўбачыць на свае вочы, а нешта нават пакаштаваць на смак.



Фота БЕЛТА.

Прамысловы турызм з'яўляецца альтэрнатывай для тых людзей, якія стаміліся ад звычайнага наведвання тэатраў, бараў і музеяў. Некаторыя прадпрыемствы здольныя калі не замяніць іх, то падаць гэтыя забавы з іншага пункту гледжання: замест тэатральнага выступлення на МТЗ вам пакажуць танец трактароў, замест наведвання кафэ дадуць магчымасць прадэгуставаць цукеркі на «Камунарцы». А музеі, у якіх захоўваюцца ўнікальныя вытворчыя артэфакты гісторыі і эпоха мінулага, ёсць літаральна на кожным заводзе.

Вытворчы турызм, як яго называюць інакш, гэта новы кірунак для нашай краіны, які добра разбаўляе ўжо існуючыя віды. Але шмат што з новага — гэта добра забытае старое. Прамтурызм доўгі час развіваўся ў Амерыцы. Завод Jack Daniel's першы раз прыняў у сябе наведвальнікаў у 1866 годзе.

Унікальна прамысловы турызм прадстаўлены ў Еўропе, дзе турыстам дэманструюць закінутыя салянаі і вугальныя шахты ў Руры і закінутыя суднабудаўнічыя заводы яшчэ з часоў Другой сусветнай вайны. Але і дзеючыя прадпрыемствы таксама адкрыты для наведвання. Шырока распаўсюджаныя экскурсіі на аўтамабільныя заводы. Прыкладамі могуць служыць завод аўтамабільнай фірмы Volkswagen у нямецкім Вольфсбургу. У Японіі — завод Mazda, дзе можна не толькі ўбачыць працэс стварэння новага аўто, але і адсачыць усю гісторыю кампаніі ў музеі пры заводзе. У Крыме вінныя прадпрыемствы адкрываюць свае вінныя склепы. Усе ахвотныя там могуць не толькі прадэгуставаць вытрыманыя калекцыйныя віны, але і набыць іх у выглядзе памятнага сувеніра.

Ва ўсім свеце прамысловы турызм развіваюць па відавочных прычынах. Гэты кірунак робіць прадпрыемствы вядомымі і павышае ўзровень даверу ў спажыўца, бо кожны чалавек бачыць, як вырабляецца тая ці іншая прадукцыя на розных этапах. А гэта, у сваю чаргу, стымулюе павелічэнне продажаў. Акрамя таго, прамтурызм не толькі абяцае прамыя выгады. У перспектыве ён павышае імідж усёй краіны.

Гаворачы аб развіцці гэтага кірунку ў нашай краіне, варта згадаць, што не так даўно на прадпрыемстве «БелАЗ» зарэгістравалі 40-тысячнага турыста. Як адзначылі ў прэс-службе Беларускага аўтамабільнага завода, экскурсіямі сёння асабліва цікавяцца студэнты і выкладчыкі айчынных і расійскіх ВНУ. Прычым ёсць як платныя экскурсіі, так і па ўзгадненні — на бясплатнай аснове. У экскурсію ўваходзіць наведванне музея, выставы спецыяльнай тэхнікі, кар'ерных самазвалаў і шэрагу цэхаў. Усе экскурсіі лёгка падладжваюцца пад прафарыентацыі наведвальнікаў. Па словах **намесніка генеральнага дырэктара па інфармацыйнай і ідэалагічнай рабоце «БелАЗа» Станіслава ЯКУБОВІЧА,** дзякуючы прамысловаму турызму прасцей прасоўваць сваю прадукцыю і станавіцца больш вядомымі для замежных інвестараў.

Таксама ў краіне для наведвання адкрыты кандытарскія фабрыкі «Камунарка», «Слодыч», прадпрыемствы «МТЗ», «Атлант», шэраг малочных заводаў і хлебазаводаў, піўзаводы «Крыніца» і «Аліварыя». Спіс далёка не поўны, аднак ён дэманструе, што кірункі ў гэтага віду турызму могуць быць зусім розныя. Разам з тым эксперты сыходзяцца ў меркаванні, што прамтурызм у Беларусі толькі пачынае сваё развіццё. Каб заняць вялікую долю на рынку турыстычных паслуг, яму неабходна пераадолець шэраг праблем. Да такіх адносяцца наяўнасць абмежаванняў па санітарных нормах, адсутнасць адладжанай лагістыкі, сродкаў на прасоўванне паслуг і на будаўніцтва дадатковай турыстычнай інфраструктуры. Разам з тым калі рэалізаваць гэтыя кірункі належным чынам, то прамысловы турызм у нашай краіне можа стаць па-беларуску ўнікальным.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

■ Ураджай-2017

Адноўленая па-еўрапейску Свіслач прыме абласныя Дажынкі

У суботу гродзенскія аграрыі збяруцца ў райцэнтры, каб ушанаваць хлебаробаў і падвесці вынікі сельскагаспадарчага года

Як паведамілі ў абласным камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні, на свята збярэцца каля 200 удзельнікаў уборачнай кампаніі, найлепшыя жывёлаводы і спецыялісты, ветэраны працы.

Гаспадары фестывалю сустрэнуць дэлегацыі з розных куткоў вобласці на мяжы Свіслацкага раёна пяснямі і караваямі, пасля гэтага госці пазнаёмяцца з адноўленым горадам. Трэба сказаць, што Свіслач не толькі змянілася знешне, але набыла шэраг новых аб'ектаў, у тым ліку прыгожы сімвал. Ім стала скульптура «Графскі шпіль» у цэнтры горада. Таксама падчас Дажынак у гарадскім парку адбудзецца адкрыццё дзвюх спартыўных пляцовак, у тым ліку трэнажорнай. Яшчэ адзін спартыўны аб'ект пачне функцыянаваць у спартыўнай школе — тут адноўлена барцоўская зала.

У райцэнтры адрамантаваны фасады адміністрацыйных будынкаў, дамоў, гандлёвых аб'ектаў. Па-новаму выглядае Дом культуры, дзе адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання найлепшых працаўнікоў аграпрамысловага комплексу рэгіёна.

Не засталіся ўбаку і камунальныя службы вобласці. Разам з работнікамі прафсаюза мясцовай прамысловасці яны прынялі ўдзел у афармленні горада кветкавымі пано, дэкаратыўнымі кампазіцыямі.

Арганізатары свята абяцаюць шэраг відовішчаў. У парадзе на пазадарожніках і квадрацыклах выступяць удзельнікі клуба «Белавежскія зубры», сярод якіх прадстаўнікі Беларусі, Літвы, Латвіі, Расіі. Пасля парада яны правядуць кальцавую гонку, траса якой праходзіць праз Белавежскую пушчу. Мінскі аэраклуб арганізуе паказальныя выступленні парашутыстаў. Аматары вышыні змогуць здзейсніць аглядныя палёты над горадам на верталёце МІ-2.

Дзяцей будзе забаўляць двухметровы робат-трансформер, які правядзе інтэрактыўныя гульні. Увесь цэнтр стане горадам майстроў.

З'явіцца ў горадзе і новая алея з 19 скульптур у выглядзе жывёл — насельнікаў Белавежскай пушчы. Такі падарунак сталіцы абласных Дажынак зрабіў кожны раён Гродзеншчыны.

Галоўнай урачыстасцю стане ўшанаванне работнікаў АПК, і ў першую чаргу, хлебаробаў, якія ўдала правялі сёлетнюю ўборачную кампанію. У вобласці атрымана 1 млн 365 тыс. тон зерня, што складае 120% да мінулагодняга ўзроўню. Сярэдняя ўраджайнасць — 42 ц/га. Найлепшымі ў вытворчасці зерня традыцыйна з'яўляюцца хлебаробы Гродзенскага раёна, якія атрымалі ўраджайнасць 75 ц/га. А ў вытворчым кааператыве імя В. І. Крамко гэты паказчык складае 110 ц/га. Лідарам сельскагаспадарчай вытворчасці будуць уручаны ганаровыя граматы і грашовыя прэміі.

Вызначыліся сталіцы наступных Дажынак. Налета фестываль прыме Іўе, а ў 2019 годзе — Смаргонь. Планаванне неабходна пры фарміраванні абласнога бюджэту, куды будзе закладзена і работа па падрыхтоўцы населеных пунктаў да рэгіянальнага свята.

Маргарыта УШКЕВІЧ. *margo@zviazda.by*

■

ГАМЕАПАТЫЯ КІБЕРБЯСПЕКІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але разам з тым, наколькі хутка развіваюцца інфармацыйныя тэхналогіі, настолькі ж у сферу інтэрнэту перамяшчаецца і злачыннасць. Прычым хакінг гэта толькі адна з пагроз, якая будзе чакаць вас у лічбавай прасторы. «Праз інтэрнэт прадаюцца наркотыкі, распаўсюджваюцца розныя віды забароненых матэрыялаў, рэалізуюцца розныя ашуканскія схемы. Усяго каля 500 відаў злачынстваў. Расія траціць 25% бюджэту на ахову і бяспеку ад знешніх пагроз. Але мы апынуліся ў тым свеце, калі камп'ютарная злачыннасць значна больш верагодная, чым любы іншы класічны від правапарушэнняў», — падзяліўся эксперт. Таксама ён удакладніў, што паводле статыстыкі Еўрапола і ФБР за паўтары хвіліны ў Еўропе адбываецца адно злачынства. За гэты ж час крадуць каля 3000 уліковых запісаў розных людзей і з'яўляецца 10 новых тыпаў шкоднаснага кода. Калі ў першым выпадку раскрыць злачынства будзе пытаннем параўнальна невялікага часу, то ў віртуальным свеце ўсё некалькі больш складана. А часам — папросту становіцца немагчымым.

Барацьбіты з кіберзлачыннасцю са шкадаваннем адзначаюць, што часта ў СМІ ідэалізуюць вобраз хакераў. Калі зламыснікі крадуць у сеціве велізарныя сумы грошай, іх называюць «высокаінтэлектуальнымі» і апісваюць як герояў лічбавага стагоддзя. Гэта, у сваю чаргу, стымулюе ў моладзі жаданне браць з іх прыклад. «Пасля чарговай гучнай справы па хакінгу, дзе зламысніка апраўдваюць або змякчаюць яму прысуд, мы часта фіксуем высокі ўзровень рэгістрацыі на хакерскіх форумах і сайтах. Некаторыя людзі, вядома, робяць гэта з цікаўнасці. Але ў цэлым трэнд застаецца — пакуль вобраз хакера паказваюць у выглядзе «Робіна Гуда», спроб пераймаць яго будзе куды больш. Аднак успрыманне хакера як «змагара з сістэмай» знікае тады, калі грошы знікаюць з вашага рахунку або з рахунку вашых родных», — растлумачыў сваю пазіцыю Ілья Сачкоў.

ПАРАДЫ ПА «КІБЕРМЕДЫЦЫНЕ»

Вы лічыце, што абаронены ад хакераў? Добра. Але хіба вы ведаеце ўсе іх магчымасці? Бо ацэнка рызыкаў і пагрозы напрамую звязаныя з бяспекай. Я ўпэўнены, вы лічыце, што антывірус вырашыць пытанне пападання шкоднаснага кода на ваш гаджэт. А калі я вам скажу, што 86% заражаных камп'ютараў мелі апошнія абнаўленні антывірусаў? Калі хакеры здольныя татальна пранікаць практычна ў любы ўчастак сеціва, то як тады ад іх абараніцца і чаму ва ўсім свеце не ўзнікаюць праблемы на АЭС альбо ў іншых стратэгічна важных кропках для дзяржавы?

Ілья Сачкоў лічыць, што на некаторыя кампаніі не нападаюць проста таму, што яны не цікавыя хакерам. «Ёсць міф, што хакеры хочуць узламаць АЭС альбо разумны горад. Як правіла хакера цікавіць заробак грошай. Узлом атамнай станцыі лёгкіх грошаў не прынясе, а зробіць хакера тэрарыстам і прыярытэтнай мэтай спецслужбаў. Акрамя сур'ёзнага тэрміну тут нічога не заробіш. У сеціве 98% злачынстваў звязаныя з грашыма. Толькі 2% — гэта кібертэарызм або шпіянаж», — растлумачыў эксперт. Разам з тым, каб абараніцца ад разнастайных рызык, буйныя прыватныя і дзяржаўныя кампаніі марнуюць мільярды долараў на кібербяспеку.

Дык можа адзін чалавек тым больш нецікавы зламысніку? І гэта не так. Каля 80% мабільнага рынку выкарыстоўвае аперацыйную сістэму Android. Гэта робіць гаджэты пад яе кіраваннем папулярнымі для ўзлому. Крадуць з іх не толькі грошы, але і асабістыя звесткі. Паводле інфармацыі Ільі Сачкова за 200 долараў зламыснік можа дамовіцца аб заражэнні 1000 тэлефонаў. Пасля таго як смартфон заражаны, хакер здольны праслухоўваць гук, адпраўляць sms ад вашага імя, загрузіць вашы выявы, зрабіць аддалены званок, зразумець, дзе вы знаходзіцеся, устанавіць праграму, украсці грошы.

«І калі ў вас на тэлефоне няма анлайн-банкінгу, то гэта зусім не значыць, што ў вас не могуць украсці грошы. Як прыклад, заражаны тэлефон можа даслаць вам паведамленне ад Google Play, у якім будзе сказана абнавіць даныя вашай карткі для аплаты пакупак сэрвісу. Для адпраўкі грошай з карткі на картку неабходныя дзве рэчы: нумар карткі і аднаразовы код, які прыходзіць да вас на тэлефон. Вірус на тэлефоне ўмее чытаць і не паказваць вам sms. Такім чынам усе грошы вашай карткі сыходзяць зламысніку ў аўтаматычным рэжыме. Акрамя таго, існуе тэхнічная магчымасць адпраўляць sms ад імя іншага чалавека. Ад імя любога з вас можна адправіць sms, і яно прыйдзе ў чат, у якім вы вялі перапіску. Не давярайце sms, у якіх просяць грошы, лагіны і паролі», — раіць эксперт. Уладальнікам Apple пры гэтым таксама не варта асабліва радавацца. Маса «слабых месцаў» існуе і ў iOS, проста Android выкарыстоўваецца часцей, таму і прыцягвае да сябе больш увагі хакераў. Таксама не забывайцеся пра вашу пошту, якая мае асаблівае значэнне. Да яе часта прывязана практычна ўсё: сацсетка, воблачныя сэрвісы, банкінг. «Усюды, дзе толькі гэта дазваляе сэрвіс, уключыце двухфактарную аўтэнтыфікацыю — механізм (2FA), які дазваляе абараніць ваш акаўнт больш надзейна, чым традыцыйны пароль. Яна ўключаецца на пошце, месенджарах, сацсетках. Гэта другі пароль, які кожны раз прыходзіць вам на мабільны тэлефон. Рэкамендую вам атрымліваць яго не ў выглядзе sms, а праз спецыяльную праграму, якая генерыруе аднаразовыя паролі на ўваход кожныя некалькі секундаў. Калі ваш пароль «падабралі», то без доступу да вашага смартфона зламыснік не патрапіць у акаунт», — растлумачыў Ілья Сачкоў.

Акрамя таго, эксперт лічыць, што наяўнасць адной пошты, якая адказвае за ўсё, у 2017 годзе таксама небяспечна. Лепш завесці некалькі акаўнтаў.

І напрыканцы: у месцах з адкрытым доступам да wi-fi карыстайцеся тэхналогіяй VPN (віртуальная прыватная сетка). Яна забяспечыць абароненую (закрытую ад знешняга доступу) сувязь публічнага злучэння пры наяўнасці высакахуткаснага інтэрнэту. Гэта значна ўскладніць жыццё тым, хто хоча ўкрасці вашы асабістыя даныя.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

Кругляншчына — край камфортны для жыцця і прывабны для бізнесу

ШЧУПЛЯНКОЎ Анатоль Леанідавіч, старшыня Круглянскага райвыканкама.

Маляўнічыя мясціны Кругляншчыны заўсёды вабілі сюды вядомых гістарычных асоб. Тутэйшымі землямі ў розныя часы валодалі канцлер ВКЛ Леў Сапега, вядомы палітычны дзеяч і аўтар пранізлівага паланэзу «Развітанне з Радзімай» Міхал Клеафас Агінскі, прэзідэнт Расійскай Акадэміі, паплечніца Кацярыны Вялікай — княгіня Кацярына Дашкава. Тут жылі рускі генерал Міхаіл Чарняеў, вядомы мастак Мікалай Неўраў. Круглянскі раён перажыў шмат эпахальных падзей, гераічна змагаўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адбудоўваў гаспадарку ў пасляваенны час, вырошчваў хлеб. Сёння ён працягвае дынамічна развівацца.

— Наш раён сельскагаспадарчы, з добра развітой будаўнічай галіной, — адзначае **старшыня Круглянскага райвыканкама Анатоль ШЧУПЛЯНКОЎ**. — Даволі буйная будаўнічая арганізацыя ПМК-266 займаецца ў раёне не толькі будаўнічымі пытаннямі, але і добра развівае турыстычную інфраструктуру. Дзякуючы іх намаганням экспарт турыстычных паслуг у нас толькі год ад году расце.

Што датычыцца аграпрамысловага комплексу, то ён прадстаўлены ў Круглянскім раёне сямю сельскагаспадарчымі арганізацыямі. Галіна стабільна развіваецца і мае станоўчыя вынікі. Сёлета, напрыклад, ураджайнасць збожжавых і зернебабовых склала каля 52 ц/га. Развіваем жывёлагадоўчы складнік. Даручэнне кіраўніка дзяржавы па будаўніцтве малочнатаварных фермаў у раёне выканана. Цяпер асноўная задача — павелічэнне жывёлагадоўчай прадукцыі. Імкнёмся болей тэхналагічна працаваць над яе вытворчасцю.

У нас жывуць вельмі працавітыя і таленавітыя людзі. І для таго, каб стварыць для іх камфортныя ўмовы, у раёне шмат робіцца. Займаемся рамонтам жыллёвага фонду, добраўпарадкоўваем дваровыя тэрыторыі, будуем жыллё і дарогі.

Робім стаўку на прадпрымальных людзей. Развіццё малога і сярэдняга бізнесу — адзін з галоўных напрамкаў. Ёсць сумеснае з расіянамі прадпрыемства па вытворчасці кандытарскіх вырабаў, гандлёвая сетка якіх прадстаўлена ў Оршы і Магілёве. Унікальнае прадпрыемства «Завод Усходні», якое спецыялізуецца на перапрацоўцы другаснай сыравіны. У іх ёсць цікавыя праекты на перспектыву. Добра развіваецца дрэваапрацоўчая галіна.

Актыўна працуем над прыцягненнем інвестыцый і стварэннем новых працоўных месцаў. У нас вельмі выгаднае месцпалажэнне. Адносна блізка і да Мінска, і да Магілёва. Тут сапраўды зручна будаваць свой бізнес. І мы адкрыты для ўсіх.

Фота з архіва райвыканкама.

ДРАНКА НА ЭКСПАРТ

Вялікі асартымент будаўнічых і палетачных нарыхтовак робіцца круглянскімі прадпрымальнікамі

Прадукцыя гатова да адгрузкі.

У большасці выпадкаў, калі ёсць добрая сыравінная база, свая піларама, дрэваапрацоўка — даволі выгадны від бізнесу. Таму канкурэнцыя тут як нідзе жорсткая. Круглянскае ТАА «Рамісдрэўкамплект» на гэтым рынку ўсяго чатыры гады. Але ўжо паспела дабіцца нядрэнных вынікаў у рабоце.

На вытворчым участку кіпіць работа. У паветры лунае бадзёры пах свежаспілаванага дрэва. **Дырэктар прадпрыемства Раман КРУКОЎСКІ** паехаў па справах у Гомельскую вобласць. Шукаю яго **намесніка Валерыя ГАНЧАРОВА**. І не адразу пазнаю яго за рулём гружанага абрэзанай дошкай аўтакара. Вось табе і начальнік.

— Сачу, каб вытворчасць не прыпынялася, — усміхаецца ён і запрашае паглядзець пілараму.

Таварыства спецыялізуецца на вырабе будаўнічых і палетачных нарыхтовак. Працэс ідзе бесперапынна. Франтальны пагрузчык «Амкадор» разгружае і падае матэрыялы да цэхаў. Там ідзе раскрыжоўванне, распілоўванне, шліфаванне. Нарыхтоўкі раскладаюцца па катэгорыях, абрэзкі дробяцца на дранку. І на ўвесь матэрыял вялікі попыт.

ПРАЦА НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ

У 2013 годзе, калі ўсё толькі пачыналася, першым спажыўцом «Рамісдрэўкамплекта» быў круглянскі «Жылкамгас». Цяпер прадпрыемства паспяхова супрацоўнічае з еўрапейскімі фірмамі. Бо стаўка робіцца на якасць. У сакавіку 2015 года таварыства атрымала сертыфікат міжнароднага ўзору FSC. І трэба трымаць планку, каб кожны год паспяхова яго пацвярджаць. Пра тое, што гэта добра атрымліваецца, сведчаць кантракты з замежнымі кампаніямі. Сярод іх спажыўцы з Германіі, Англіі. «Рамісдрэўкамплект», дарэчы, сёння адзінае сярод аналагічных прадпрыемстваў у Круглянскім раёне, якое наўпрост працуе з замежжам. Наогул, 74% выручкі прадпрыемства за мінулы год — валюта. Сярод сталых партнёраў — ЗТАА «ВМГ Індустры» (партнёр IKEA) у Магілёве, ЗТАА «Кронаспан» у Смаргоні, замежнае вытворча-будаўнічае прадпрыемства «БРЫЗАНТ-Энэрджы Цэнтр» у Лёзне. У круглянскіх дрэваапрацоўшчыкаў яны рэгулярна бяруць дранку і пілавінне. А летам «Рамісдрэўкамплект» выйграў тэндар на пастаўку 1000 квадратных метраў дошкі магілёўскай малочнай кампаніі «Бабуліна крынка».

Тавар прадпрыемства можна ацаніць, завітаўшы на вуліцу Савецкую ў Круглым. Да абласнога фестывалю хлебаробаў «Дажынкі-2015» яно ўстанавіла прыгожую агароджу ўздоўж шашы. Не скардзіцца на якасць піламатэрыялаў і насельніцтва, якое рэгулярна звяртаецца на прадпрыемства ў пошуках будаўнічых матэрыялаў для рамонту.

СКАРЫСТАЛІСЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАДТРЫМКАЙ

Дасягнуць высокіх вынікаў у працы немагчыма без сучаснай тэхнікі і абсталявання. Усё гэта каштуе вялікіх грошай, але пытанне вырашаецца з дапамогай крэдытаў. У пачатку дзейнасці быў закуплены ў лізінг лесапагрузчык «Амкадор 352 Л», сёлета ён цалкам выкуплены. Фарвардар быў набыты па праграме Мікрабізнесу Старт Плюс з дапамогай Беларусбанка пад стаўку рэфінансавання мінус 4%. Бралі тэхніку пад 14%, а сёння працэнт знізіўся да 7%. Адчуваеце розніцу?

Валерый ГАНЧАРОЎ – і за намесніка начальніка, і за кіроўцу аўтакара.

Справы з новай тэхнікай ідуць нашмат хутчэй. Прычым звяртаюць тут увагу, на 100% беларускай тэхнікай. Па сваёй прадукцыйнасці той жа фарвардар замяніў на нарыхтоўцы лесу два «Уралы» і трактар. А яшчэ вельмі выручае пагрузчык МАЗ з гідраманіпулятарам. Ён быў набыты ў вытворцы па кантракту ў растэрміноўку. Гарантам выступіў усё той жа Беларусбанк. Наогул, з банкам таварыства працуе ў цесным узаемадзеянні. Тут з вялікай удзячнасцю гавораць пра **дырэктара ЦБУ №715 філіяла 700 ААТ «ААБ Беларусбанк» горада Круглае Марыю Віктараўну Лазараву**. І пра **супрацоўніцу крэдытнага аддзела Інэсу Міхайлаўну Слізунову**.

МАЗ з гідраманіпулятарам.

ДРАЎНІНА СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

Атрымаць якасны лес сёння няпроста, вельмі вялікі попыт. І трэба быць, як той казаў, увесь час ў тонусе, сачыць за падзеямі на Беларускай універсальнай таварнай біржы і хуценька рэагаваць, калі прадставіцца добры выпадак. Нарыхтоўчыя ўчасткі таварыства знаходзяцца па ўсёй Беларусі. Ёсць лесасекі на тэрыторыі Гомельскага лесагаспадарчага аб'яднання (адкуль прывозіцца драўніна хвойных парод), Мінскага, а цяпер яшчэ і Віцебскага.

Кіраўніцтва клапоціцца, каб дзейнасць таварыства была па максімуме эканамічна незалежнай. Нядаўна пабудаваны склад для гатовай прадукцыі, вырашаецца пытанне з набыццём ва ўласную маёмасць вытворчых плошчаў. Пакуль іх прыходзіцца арандаваць.

ЗАПРАШАЕМ НА ПРАЦУ

Чатыры гады таму дзейнасць прадпрыемства пачыналася з васьмі чалавек, цяпер тут 40 працуючых. Толькі сёлета быў працаўладкаваны 21 чалавек. І попыт на працоўныя рукі не знікае. Тут па-ранейшаму будуць рады падсобным рабочым, рамшчыкам. Так што, калі ласка. Выдаткі за праходжанне медкамісіі таварыства бярэ на сябе. Як і па вакцынацыі сваіх работнікаў. Штогод на разліковы рахунак раённай паліклінікі паступаюць грошы за паслугі па прышчэпках ад грыпу.

На прадпрыемстве ёсць шмат адданых працы людзей, якія працуюць ледзь не з адкрыцця таварыства. Сярод іх **начальнік вытворчасці Васіль ЖУКАЎ, кіроўцы МАЗаў Віктар ЯКУШАЎ і Аляксей МЯДЗВЕЦКІ, падсобны рабочы Уладзімір ГАЛЫГІН, кіроўцы «Амкадора» Мікалай СІМАКОЎ і фарвардара Валянцін ПЕХЦЕРАЎ** (шматдзетны бацька, дарэчы). Хай не крыўдзяцца тыя, каго ў гэтым спісе няма. Па сутнасці, на прадпрыемстве гатовы былі пералічыць увесь дзеючы штат. Але на газетнай старонцы няма магчымасці гэта зрабіць. Ад імя кіраўніцтва ўсім работнікам таварыства вялікі шчыры дзякуй за добрасумленную працу і пажаданне дабрабыту і шчасця ім і іх сем'ям.

УНП 790820452

Другое жыццё палімераў

Карэспандэнт «Звязды» паназірала, як на заводзе «Усходні» з камунальных адходаў нараджаюцца карысныя для краіны рэчы. Гэта прадпрыемства можна смела лічыць экалагічна арыентаваным, бо тут штомесяц перарабляюць да 200 тон небяспечных для прыроды адходаў з пластыку. ТАА «Завод «Усходні» спецыялізуецца на перапрацоўцы другасных рэсурсаў, вытворчасці кампазіцыйных матэрыялаў, фарбавальнікаў на аснове другаснага ПЭТ і поліэтыленаў, ліццёвых вырабаў.

Дырэктар завода «Усходні» Андрэй ЦІШУРОЎ.

Пэт-бутэлька: новы фармат

Прадпрыемства мае дзве вытворчыя пляцоўкі — у Магілёве і Круглым. У Магілёве ствараюць пэт-шматкі з пэт-бутэлек, якія потым ідуць на вытворчасць поліэфірных валокнаў і геатэкстыльных матэрыялаў. Без іх сёння не абысціся пры дарожным будаўніцтве, пракладцы газаправодаў, нафтаправодаў, балясціроўцы труб для пракладкі іх на дне мораў і акіянаў, вырабе тэкстыльнай абіўкі для салонаў аўтамабіляў.

На пляцоўцы ў Круглым створана некалькі патокаў. Тут адпрацаваныя другасныя матэрыяльныя рэсурсы ператвараюцца ў другасныя палімеры поліэтылену, поліпрапілену, поліэфіраў. Сыравіна для вытворчасці завозіцца з палігонаў цвёрдых бытавых адходаў або пляцовак для збору бытавога смецця. І калі ў 2015 годзе на заводзе было перапрацавана 1588 тон разнастайных другасных адходаў, то сёлета толькі за паўгода 1814 тон. І гэта, кажуць на «Усходнім», не мяжа.

Разам з **інжынерам-тэхнолагам Ігарам ГОЛУБЕВЫМ** накіроўваемся на сартавальны участак, дзе спрасаваныя ў вялікія блокі пластыкавыя адходы разбіраюцца і на транспарцёры падаюцца наверх. Там рабочыя сартуюць сыравіну па колеры і тыпе матэрыялу, з якога яна выраблена. Сартаванне — наогул вельмі адказны момант у рабоце. Займаюцца ім спецыяльна падрыхтаваныя людзі. Поліэтылен, поліпрапілен, поліэтыленцэрэфталат плюс іх размежаванні па колерах, тыпах — усяго атрымаецца 20 разнавіднасцяў сыравіны, якія трэба апрацаваць паасобна.

Асобна перапрацоўваюцца поліэтыленавыя і поліпрапіленавыя плёнкі. Поліэтылены, напрыклад, ідуць на вытворчасць другаснай гранулы. З яе беларускія прадпрыемствы робяць плёнкі, смеццевыя пакеты, ліццёвыя вырабы. Першасны поліпрапілен даражэйшы, і яго немэтазгодна ўсюды выкарыстоўваць, а гэты больш танны і не менш якасны. Лінейны поліэтылен высокага ціску перапрацоўваецца ў стрэйч-плёнку для сельскай гаспадаркі, — бачылі ўпакаваныя ў яе рулоны сена на калгасным полі? Безадходны матэрыял. Вясной калгасы вяртаюць яе на перапрацоўку зноў.

Інавацыйны прадукт

Сёлета на заводзе пачалася вытворчасць фарбавальніка для поліэфірных валокнаў на аснове ПЭТ-гранулята. Добрую справу падтрымаў Магілёўскі аблвыканкам. З яго інавацыйнага фонду на рэалізацыю праекта было выдзелена 800 тысяч рублёў.

— У Беларусі толькі мы займаемся падобнымі фарбавальнікамі, — удакладняе суразмоўнік. — Амаль усе яны ідуць на экспарт у Расію.

За восем месяцаў з пачатку года выраблена каля 50 тысяч кілаграмаў фарбавальніку на аснове другаснага ПЭТ. Амаль увесь гэты аб'ём адгружаны расійскім і беларускім спажыўцам — ЗАТ «РБ груп», ТАА «Селена», ЧУП «Тэхмантажгруп», ААТ «Камітэкс», ТАА «Наватэх», «ЮнітПласт». Працягваюцца пошукі новых патэнцыйных спажыўцоў у Расіі. Вядуцца перагаворы аб пастаўках прадукцыі ў Польшчу і Украіну. Вытворчая магутнасць дазваляе выпускаць да 40 тон гэтай прадукцыі штомесяц.

Дарэчы, полімерны фарбавальнік на аснове тытану шырока выкарыстоўваецца ў якасці напаўняльніка ПЭТ-валокнаў, якія прымяняюцца, напрыклад, пры вытворчасці падушак, коўдраў, адзення і гэтак далей. Дастаткова згадаць папулярны зараз халафайбер.

Асартымент пашыраецца

Нядаўна на заводзе асвоілі выпуск паліамерных паддонаў з дробленых сумесяў поліэтылену і іншых палімераў. Іх ахвотна бяруць птушкафабрыкі, цукровыя заводы, мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы.

— Зараз паглыбляем перапрацоўку, каб мець больш высокую дабаўленую вартасць прадукцыі, выпрацоўваем новыя віды кампазіцыйных матэрыялаў, — дзеліцца планамі інжынер-тэхнолаг.

А хутка на «Усходнім» будзе наладжана вытворчасць труб малога і вялікага дыяметраў. Адна з ліній ужо цалкам сабраная і працуе ў тэставым рэжыме. У якасці зыходнага матэрыялу тут выкарыстоўваецца ўся тая ж гранула.

Вельмі зручныя паддоны, асабліва для харчовай галіны.

Каманда прафесіяналаў.

Моцная каманда

«Завод «Усходні» — прадпрыемства новага пакалення. Такіх у краіне пакуль няшмат. Падабралася добрая каманда аднадумцаў і прафесіяналаў. Дырэктар завода Андрэй Цішуроў, намеснік дырэктара Аляксандр Рагаза, інжынер-тэхнолаг Ігар Голубеў, інжынер-энергетык Аляксандр Смірноў, механік Леанід Вавілаў, майстры ўчасткаў Дзяніс Курганаў і Жанна Хмаранкова, менеджар па збыце Таццяна Буліцкая, камерцыйны агент Таццяна Дудкевіч і іншыя — менавіта дзякуючы ім вытворчасць развіваецца, знаходзіцца новыя рынкі збыту, асвойваецца перадавая прадукцыя.

— Трэба няспынна рухацца наперад, — салідарныя яны ў сваіх памкненнях. — Сёння імкліва мяняецца рынак, удасканальваецца абсталяванне нашых партнёраў, а значыць, таксама шмат пра што гаворыць. Сёння наша гранула становіцца асновай для нятканых матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў будаўніцтве, быце чалавека, сельскай гаспадаркі, на вытворчасцях. Мы наладзілі выпуск тых жа паддонаў, якія раней завозіліся ў Беларусь з-за мяжы.

Сёння на прадпрыемстве працуе болей за 100 чалавек, але тут плануюць пашырацца і ствараць новыя працоўныя месцы і запатрабаваныя часам прадукты. Вырабы «Усходняга» карыстаюцца попытам не толькі ў буйных прадпрыемстваў. Тыя ж індывідуальныя прадпрымальнікі вельмі ахвотна бяруць гранулы для вытворчасці плёнкі, палімерных сетак, шапачак для цвікоў. Урны, аўтаручкі, трубы — з гранулы наогул можна зрабіць усё што хочаш. І «Завод «Усходні» гатовы супрацоўнічаць са спажыўцамі любога ўзроўню.

УНП 790484962

ЧАТЫРЫ МУЗЕІ... АД ПМК

Мікалай КУРНОСАЎ з новым экспанатам — косткай маманта.

Выпадак сам па сабе ўнікальны: Круглянская перасоўная механізаваная калона №266 выступіла ініцыятарам стварэння некалькіх музеяў. Менавіта дзеля захавання гісторыі. Усе чатыры музеі размешчаны на тэрыторыі створаных намаганнямі прадпрыемства маляўнічых Мікалаеўскіх сажалак — вельмі папулярнага сёння ў беларусаў і расіян экатуркомплексу. Раней тут знаходзілася вёска Лыскаўшчына, тая самая, дзе апошнія гады свайго жыцця правёў карэнны масквіч, сусветна вядомы мастак Мікалай Неўраў. На жаль, скончыў ён сваё жыццё трагічна. Тут жа і быў пахаваны. Дом, дзе ён жыў, прыйшоў у заняпад, але будаўнікі ПМК-266 аднавілі і зрабілі ў яго пакоях тры музеі — адзін прысвечаны непасрэдна мастаку, другі — Друцкаму княству, якое размяшчалася на тэрыторыі Круглянскага раёна. Яшчэ адно памяшканне афармлена ў стылі беларускай хаткі канца XIX — пачатку XX стагоддзя — покуць, на палічках посуд, шмат ручнікоў, прадметаў народных промыслаў. Для музея эпохі СССР пабудаваны асобны будынак. У 16 залах памяшкання (менавіта столькі было рэспублік у СССР з улікам Карэла-Фінскай) размешчана больш чым тры тысячы экспанатаў.

— Мы не сталі рабіць акцэнт толькі на ідэалогіі, — кажа начальнік юрыдычнага аддзела ПМК-266 Мікалай Курносаў. — У нас цікавыя экспанаты. Звярнаем увагу моладзі на два асабліва важныя для кар'ернага росту савецкага чалавека дакументы — камсамольскі білет і партыйны.

Радыёпрыёмнікі, пішучыя машынкі, першыя фотаапараты, патэфоны, пласцінкі, вагі, лічыльнікі, «каза», на якой савецкія дзеці каталіся з горкі, — нават не верыцца, што ўсяго толькі некалькі дзесяцігоддзяў таму ўсё гэта было вельмі запатрабаванае і важнае. Шмат чаго падорана жыхарамі раёна, наведвальнікамі, якія засталіся ў захапленні і вырашылі ўнесці сваю лепту. Шмат рэчаў перадаў у музей непасрэдна начальнік ПМК Мікалай Патрончык. Тут некалькі яго матацыклаў, веласіпед, кубкі і ўзнагароды за працоўныя поспехі. Нядаўна ў музеі з'явіўся куток народных вынаходак. Сярод экспанатаў зроблены з пластыкавай бутэлькі «ключ» для адкрывання банак з накрыўкамі твіст-оф, адпуджавальнік кратоў з пластыкавай бутэлькі. Музей жывы і пастаянна папаўняецца новымі знаходкамі. Не хапае медыцынскіх экспанатаў, адзначае суразмоўнік, былі б удзячны за слыхавы апарат савецкага перыяду, градуснік, упакоўкі ад любімых у народзе духоў Дзінтарс, Чырвоная Масква. Папаўняюцца фонды і астатніх музеяў. Нядаўна адзін жыхар перадаў костку маманта, ёсць рэчы часоў ВКЛ, перыяду Друцкага княства.

Не выключна, што хутка на тэрыторыі Мікалаеўскіх сажалак з'явіцца яшчэ адзін музей — пад адкрытым небам, пяты па ліку.

Музей эпохі СССР.



Беларуская хатка.

Падчас правядзення ў Круглым абласнога фестывалю «Дажынкі» было прынятае рашэнне помнік Леніну перавезці з горада ў экатуркомплекс — як экспанат савецкай эпохі. Тут правадыр стаў яшчэ бліжэйшы да народа. У тым сэнсе, што вырашана было адказацца ад чатырохметровага пастамента, яго зрабілі больш сціплым і невялічкім. Непадалёк знаходзяцца яшчэ два помнікі — рускаму генералу Міхаілу Чарняеву і мастаку Мікалаю Неўраву. Дарэчы, надпісы на граніце на беларускай мове.

— Падтрымліваем роднае, нацыянальнае, — заўважае Мікалай Курносаў. — У нас нават на дзвярах рэстарана надпісы на беларускай, рускай і англійскай мовах. Асноўныя кліенты — замежнікі, трэба, каб яны разумелі, што адпачываюць на тэрыторыі беларускай дзяржавы. Арганізуем прэс-туры, праводзім разнастайныя мерапрыемствы. Вось нядаўна арганізавалі міжнародны фестываль пчаляроў. Запрашалі ўдзельнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Прыбалтыкі — прыехала больш чым 130 чалавек. Сёлета трэці раз праводзілі міжнародны форум псіхолагаў Беларусі, Расіі і Украіны.

Матэрыялы выпуску падрыхтавалі Вольга ГЕЦЭВІЧ, Святлана СУШКО, Нэлі ЗІГУЛЯ (zigulya@zviazda.by). Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

Извещение о проведении 29 ноября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	– «лит.А1-2/к-кп, здание прачечной» общей площадью 1012 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-34660; назначение: здание неустановленного назначения) с элементами благоустройства: автодорога (540 кв. м), площадка под автостоянки (240 кв. м), пешеходная дорожка (206 кв. м), площадка под мусоросборник (4 кв. м), площадка (3 кв. м), бордюр 0,16 (40 кв. м, 251,22 м п.), ограждение территории (16,40 м п.), ограждение площадки под мусоросборник (5,50 м п.), ворота (4,40 м п.), ворота (7,60 м п.); – электросети КЛ-0,4КВ (инвентарный номер по бухгалтерскому учету 3000842)
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Кабушкина, д. 64
Сведения о земельном участке	Площадь – 0,3900 га, кадастровый номер 500000000002001769, назначение – эксплуатация и обслуживание здания прачечной
Продавец имущества	ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов без учета НДС	598 878,45 бел. руб.
Сумма задатка	59 000,00 бел. руб.
Условия торгов	Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов (покупатель) обязуется согласовать дальнейшее функциональное назначение использования приобретенного объекта недвижимости с Минским городским исполнительным комитетом с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 23.04.2003 года №165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации»
Наличие обременений	Аренда

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона (с условиями) на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 29 ноября 2017 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 16.11.2017 по 27.11.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА РУП "БРЕСТСКАЯ ФАБРИКА СУВЕНИРОВ «СЛАВЯНКА»

Предмет торгов	Начальная цена	Размер задатка
Лот – Трактор Беларус 82.1, регистрационный знак АВ-1 3541, год выпуска 2008 г.	15681,00 рублей	468,00 рублей
Условия продажи	Без условий	
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»	
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона	
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи	
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 УНП 201028245 BIC Банка BPSBBY2X	
Аукцион состоится 19 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325		
Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52		
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00		
Последний день приема заявлений – 18 декабря 2017 г. до 17.00		

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел.: + 375 (214) 41 72-95, тел/факс 41-80-30

Предмет аукциона – Имущество в составе объектов недвижимости, оборудования, материалов, реализуемое одним лотом, в составе:

Наименование	Назначение	Общ. пл.	Инв. номер
Здание автовесовой	Здание административно-хозяйственное	128,7 кв. м	250/С-33939
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/1, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Железнодорожные подъездные пути	Сооружение специализированное железнодорожного транспорта	1542,4 м	250/С-43216
Составные части и принадлежности: подъездной путь, в т. ч. переезд, три водопропускные трубы; подъездной путь, в т. ч. повышенный путь; подъездной путь, в т.ч. стрелочный перевод; подъездной путь, в т.ч. стрелочный перевод			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Здание бытовых помещений	Здание административно-хозяйственное	110,8 кв. м	250/С-33938
Составные части и принадлежности: дороги и проезды заводской территории наружной площадью 7735 кв. м; забор (металл) длиной 19 м; забор (панели железобетонные) длиной 71,7 м; забор (столбы ограждения 20 шт.); забор (панели железобетонные) длиной 181,8 м; забор (металл) длиной 2 м; калитка; забор (металл) длиной 98,1 м; 2 ворот; забор (металл) длиной 49,5 м			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/5, в 0,3 км к востоку от д.Ксты			
Компрессорная с центральным тепловым пунктом	Здание специализированное коммунального хозяйства	586,6 кв. м	250/С-37672
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Склад извести	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	65,8 кв. м	250/С-33940
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/2, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Склад цемента	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	68,3 кв. м	250/С-34542
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/4, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Склад цемента	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	67,8 кв. м	250/С-34543
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/3, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Склад цемента	Сооружение специализированное складов, хранилищ	61,3 кв. м	250/С-39624
Составные части и принадлежности: ёмкости			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, склад цемента			
Здание теплогенераторной с котельной	Здание специализированное коммунального хозяйства	157,4 кв. м	250/С-33941
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А/6, в 0,3 км к востоку от д. Ксты			
Внеплощадочная водопроводная сеть хозпитьевая	Сооружение специализированное водохозяйственного назначения	988 м	250/С-39077
Составные части и принадлежности: участок сети (5 трубопроводов напорных, 4 колодца)			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманском с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д.Ксты от колодца в г.Полоцке, р-н ул. Строительной, 30/6 до колодца ВКЗ			
Внутриплощадочная водопроводная сеть	Сооружение специализированное водохозяйственного назначения	867,2 м	250/С-37673
Составные части и принадлежности: трубопровод напорный, 11 колодцев, водопровод ввода			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, водопроводная сеть			
Сети связи и сигнализации	Сооружение специализированное связи	750,1 м	250/С-39080
Составные части и принадлежности: участок линии электросвязи, участок линии телефонной канализации			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12 в 0,3 км к востоку от д. Ксты, сети связи и сигнализации территории УПТК			
Электросети	Сооружение специализированное энергетики	658,4 м	250/С-43214
Составные части и принадлежности: два участка линии электропередачи			
Адрес: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманский с/с, 12А, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, электросети			

В состав лота входит следующее оборудование

Наименование	Инв. №	Наименование	Инв. №
Весы автомобильные АЦ-40	47226	Емкость под известь V-10	42076
Установка мак-бетон (3 ед.)	42067, 42068, 42070	Трансформаторная подстанция ГКТП 10/04-160 кВт	40014

С перечнем оборудования, материальных запасов (сырье, материалы, инвентарь), входящих в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

Сведения о земельных участках	Для обслуживания сооружения железнодорожных подъездных путей с объектами хранения материалов предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 7,9371 га. Ограничения (обременения) прав: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 В, площадь 0,5681 га
	Для содержания и обслуживания строений и сооружений производственной базы предоставлен участок на праве постоянного пользования общ. пл. 0,8240 га.
	Для обслуживания опоры линии электропередачи 10 кВ сооружения электросети, продавцу на праве постоянного пользования предоставлены земельные участки пл. 0,0015 га (3 участка) и 0,0005 га

Начальная цена с НДС 20%: 339 853,27 белорусских рублей BYN
Шаг аукциона: 16 992,64 белорусских рублей BYN

Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Ответственное лицо: Мысник Наталья Васильевна, заместитель управляющего, контактный телефон МТС: +375 29 516-32-23

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, **получатель платежа** ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Срок оплаты: не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

Затраты на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**28.11.2017 в 12.30 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал**
Дата и время окончания приема документов	**24.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by

Извещение
о проведении 27 декабря 2017 г. аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Знаменском сельском Совете, Брестского района, Брестской области

№ лота	Местоположение и кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Начальная (стартовая) стоимость	Сумма задатка, руб.	Расходы на изготовление градостроительного паспорта, земельно-кадастровой документации, регистрацию земельного участка, руб.	Целевое назначение земельного участка
1	Брестская обл., Брестский район, аг. Страдечь, пер. Северный, 12 121280403601000816	0,2042	10 000	1 000	445 рублей, 72 копейки (возмещение расходов на объявления по акту выполненных работ, после размещения)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома

Земельный участок расположен на расстоянии до 15 км от г. Бреста в аг. Страдечь по пер. Северному. Подъезд к участку осуществляется по временной схеме до разработки квартала индивидуальной застройки и строительства дорог согласно разработанной документации. Имеется возможность электрификации. Участок свободен от застройки.

Аукцион будет проводиться **27 декабря 2017 г. в 10.00** по адресу: Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (в здании сельисполкома). Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Знаменского сельисполкома BY 94 AKBB 3641 0000 00 31 8100 0000, в ф-ле № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC-AK BBBY 21100, УНП 200036617, код платежа 4901, суммы задатка в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающего личность покупателя. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления **20 декабря 2017 г. до 17.00. Контактные телефоны: 95-51-35, 95-51-36, 95-51-37**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 47-20-56.

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029) 896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru.

Наименование объекта, начальная цена, задаток
Лот №1. Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier», тип PTS 4/J с накатным устройством NEUENHAUSER, электронной жаккардовой машиной тип SX фирмы «Staubli», дизайнерской программой и рамной конструкцией, инв. №145057, год выпуска 2012 г. Нач. цена: 53 760 руб. без НДС. Задаток: 5 376 руб.
Повторные торги состоятся 30.11.2017 в 11.00 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: с 15.11.2017 с 8.30 по 29.11.2017 до 17.30. Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Объект находится по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 62. Условия: оплата НДС сверх цены продажи имущества, демонтаж оборудования осуществляется за счет покупателя. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 24.08.2017; 24.10.2017.

Задаток перечисляется на р/с: №BY70BLBB30120300082525001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., BIC BLBBBY2X, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. **Победитель торгов (претендент на покупку) обязан:** в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

■ Супраць наркотыкаў

ХВОРАГА — ЛЯЧЫЦЬ, А ДЫЛЕРА...

Для процідзеяння незаконнаму абароту наркотыкаў органы ўнутраных спраў актыўна прыцягваюць грамадскія арганізацыі

Яны пачалі аказваць істотную дапамогу органам унутраных спраў, установам адукацыі, грамадзянам, вызваленым з месцаў пазбаўлення волі, а таксама сузалежным, якія сутыкнуліся з ужываннем наркотыкаў блізкім чалавекам. Сваякі нарказалежнага ў першую чаргу заклапочаны ратаваннем, аднак задача гэта настолькі няпростая, што шанцаў справіцца з ёю ў адзіночку амаль няма.

— Для нас важна захаваць жыццё і знізіць шкоду ад негатыўных наступстваў спажывання наркотыкаў, і тут асаблівую важнасць набывае работа з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, — адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Генадзь КАЗАКЕВІЧ.** — У перспектыве наша сумесная работа абавязкова будзе спрыяць зніжэнню ўзроўню латэнтнасці наркаманіі. Неабходна валодаць аб'ектыўнай інфармацыяй, каб прымаць адэкватныя меры, не дапусціць разрастання маштабу наркаманіі ў краіне. На гэта павінна працаваць і першасная прафілактыка, ролікі і плакаты антынаркатычнага зместу, якія ў вачах дзяцей і падлеткаў выглядаюць часам прывабна, прымушаюць зрабіць адваротную выснову — «трэба пакаштаваць». Любая інфармацыя, якую атрымлівае грамадства, павінна быць зразумелай і фарміраваць адназначнае грамадскае меркаванне аб непрыняцці ўсяго, што звязана з наркапагрозай.

Некалькі гадоў таму па ініцыятыве МУС быў распрацаваны комплексны план, у якім упершыню ў якасці выканаўцаў былі згаданы грамадскія арганізацыі. Гэта было прызнаннем той ролі, якую яны маюць у вырашэнні сур'ёзнай праблемы. Валанцёры атрымалі больш шырокі доступ у шэраг устаноў, дзе можна выступаць перад маладзёжнай аўдыторыяй, павышаць узровень ведаў.

— Сем'і, дзе ёсць людзі з залежнасцю, неабходна вучыць правільна рэагаваць на хворага, яны павінны разумець, што слёзы і ўгаворы тут не дапамогуць, — кажа **старшыня грамадскага савета Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Маці супраць наркотыкаў» Ірына ЛУК'ЯНОВІЧ.** — Арганізацыя наша складаецца галоўным чынам з валанцёраў — людзей, якія ў мінулым самі ўжывалі або мелі праблемы іх дзеці. Нават калі такія хворыя замешаныя ў злачыннай дзейнасці, для нас важна, каб яны атрымалі магчымасць прайсці курс лячэння, і не толькі нейкі медыкаментозны курс, а з працяглай рэабілітацыяй, каб можна было гаварыць пра ўстойлівую рэмісію. Калі дзяржава не будзе займаць цвёрдую пазіцыю ў пытаннях барацьбы з наркаманіяй, то ў нас з'явіцца больш кліентаў і нам усім будзе складаней, а таму без шматбаковага супрацоўніцтва не абысціся.

Паводле слоў **старшыні праўлення Беларускага грамадскага аб'яднання «Пазітыўны рух» Ірыны СТАТКЕВІЧ,** для любога, хто звяртаецца з праблемай наркаспажывання, зварот ананімны і бясплатны. У першую чаргу прапануецца сацыяльная адаптацыя, аднаўленне парушаных стасункаў і сувязяў, зніжэнне шкоды, медыцынская дапамога. Псіхасацыяльнай рэабілітацыяй з удзелам псіхолагаў і сацыяльных работнікаў займаецца і **мясцовы фонд «Цэнтр здаровай моладзі», дырэктар якога — Алена ДАВЫДАВА** — расказвае аб цесным супрацоўніцтве з МУС. Яго прадстаўнікі тлумачаць на групах узаемадапамогі некаторыя аспекты Крымінальнага і Адміністрацыйнага кодэксаў. «Мы адчуваем падтрымку і з боку адміністрацый розных раёнаў, калі нам выдзяляюцца памяшканні для такой работы», — кажа яна.

Прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў працуюць і над тым, каб дапамагчы бацькам усвядоміць ступень уласнай віны. На жаль, у большасці выпадкаў блізкія спяшаюцца абвінавачваць у няпростай сітуацыі каго толькі можна, але не сябе. Многія катэгарычна не жадалі верыць у тое, што іх дзеці аказаліся ўцягнутымі ў гандаль і спажыванне тых жа спайсаў (а нярэдка гэта спалучаецца), наракалі на жорсткае заканадаўства, на тое, што многае не даказана. Бацькі пачалі аб'ядноўвацца і гаварыць аб тым, што іх дзеці апынуліся за кратамі несправядліва, памылкова...

— Па-чалавечы можна зразумець гора тых маці, дачок, жонак, якія сутыкнуліся з тым, што блізкі чалавек трапіў за краты на працяглы тэрмін. Праблема ператварылася ў інфармацыйную нагоду для таго, каб папракаць тыя ж органы ўнутраных спраў, — разважае Генадзь Казакевіч. — Наша заканадаўства не самае жорсткае. Аналіз заканадаўчай базы самых розных краін свету паказаў, што за гандаль наркотыкамі ёсць і смяротнае пакаранне, і пажыццёвае пазбаўленне волі. Хворага — спажыўца — неабходна, вядома, лячыць. А дылер павінен адбываць пакаранне. І мы свайго стаўлення да гэтага ніколі не памяняем, бо за кожным дылерам ёсць невялікія могілкі. Там тыя, хто загінуў ад перадазіроўкі. Але ёсць яшчэ і разбураныя або нястворaныя сем'і, ненароджаныя дзеці... Таму самае сур'ёзнае пакаранне — пазбаўленне волі да 25 гадоў — прадугледжана за распаўсюджванне наркотыкаў.

Аналіз прымянення мер гуманізацыі пакаранняў паказвае, што менавіта да зняволеных нарказалежных дзяржава часцей прымяняе практыку замены пакарання на больш мяккае, на ўмоўна датэрміновае вызваленне. Мы не збіраемся адступаць ад той жорсткай палітыкі, якую праводзіць дзяржава, а вось правапрымяняльная практыка падлягае пераасэнсаванню, і гэта можа быць працэс абмеркавання з прыцягненнем грамадскасці. Гэта сітуацыя не папрокаў і нападак, а дыскусіі і лагічнага выніку.

Органы ўнутраных спраў даўно адышлі ад таго, каб злавіць за руку шараговага наркамана. Пытанне не ў спажыўцах, а ў арганізатарах бізнесу, спыненні дзейнасці злачынных груп, якія распаўсюджваюць наркотыкі. Палова ўсіх зарэгістраваных нарказлачынстваў звязана менавіта са збытам.

Крымінальная нарказлачыннасць ужо сышла з вуліц у сеткі. Да 90 працэнтаў наркотыкаў і псіхатропаў распаўсюджваецца сёння праз сетку інтэрнэт бескантактным спосабам. З'явілася нават паняцце даркнэту — прыватнай сеткі паміж даверанымі асобамі, якая актыўна выкарыстоўваецца злачынцамі ў наркаабароце. Схематычна выглядае гэта так: той, хто шукае наркотык, знаходзіць адрас «магазіна», дзе пазначана, што і колькі. Праз плацежныя тэрміналы з адкрыццём электроннага кашалька пераводзіцца адпаведная сума на пазначаны электронны кашалёк, пасля чаго пакупніку высылаецца адрас закладкі — месца, дзе знаходзіцца наркотык. У выніку наркадылеры, якія робяць такія закладкі, ведаць не ведаюць арганізатараў злачыннага бізнесу, якія могуць знаходзіцца наогул на тэрыторыі іншай краіны. Актыўна прымяняюцца пры гэтым інтэрнэт-тэхналогіі — браузеры, якія шыфруюць ір-адрасы, інтэрнэт-месенджары з пратаколамі шыфравання, а таму немагчыма кантраляваць сам працэс перапіскі. І тут неабходна выбіраць: абарона асабістага жыцця, тайны перапісак ці нацыянальная бяспека? У прыярытэце, вядома, апошняе.

Ранейшыя формы і метады ажыццяўлення аператыўнай работы ўжо не надта эфектыўныя. Таму адшукваюцца новыя тэхнічныя сродкі, новыя методыкі. У падраздзяленнях наркакантролю створаны структуры інтэрнэт-разведкі, дзе займаюцца не толькі пошукам, выяўленнем, спыненнем саміх злачынстваў, але і блакіраваннем інтэрнэт-кантэнту. Як правіла, гэта атрымліваецца. Блакіруюцца нашымі праваахоўнікамі і электронныя грошы на кашальках — летась на суму каля 300 тысяч долараў. Ажыццяўляецца супрацоўніцтва і з банкамі, а таксама тымі суб'ектамі, якія падтрымліваюць электронныя кашалькі. Дарэчы, беларускі вопыт прымянення такой практыкі прызнаецца і іншымі краінамі.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

Школьнікі-«мінёры»

Іх прываблiваюць у асноўным абяцаннем высокага заробку. Навучаюць рабіць закладкі наркотыкаў, а таксама метадам канспірацыі, каб тыя ўмелі сыходзіць ад назірання, шыфраваць перамовы і г. д. Нярэдка да такой дзейнасці прыцягваюць школьнікаў, таму з 2014 года быў зніжаны парог узросту крымінальнай адказнасці да 14 гадоў. Аднак і сёлета праваахоўнікі затрымлівалі падчас закладак школьнікаў, а таксама навучэнцаў розных устаноў. За распаўсюджванне затрыманы нават выкладчык ВНУ. Аднак у большасці сваёй размова ідзе пра тых, хто нідзе не вучыцца і не працуе. Як правіла, гэта мужчыны ва ўзросце 16—30 гадоў. Але трапляюцца нават цяжарныя жанчыны і сямейныя пары. У Мінскай вобласці была нядаўна затрымана сямейная пара, у якой канфіскавана марыхуана ў сухім выглядзе вагой звыш 36 кг.

«Сінтэтыка» крыху адступіла

У 2014 годзе «сінтэтыка», якая аказвае самае згубнае ўздзеянне на арганізм (ад яе былі шматлікія выпадкі перадазіроўкі і гібелі), складала 80 працэнтаў наркатычнага рынку. Сёння яе доля на рынку 40 працэнтаў. Яшчэ 30 працэнтаў прыпадае на марыхуану (айчынную і прывезеную), 10 — на апіоіды, гашыш (наркотыкі расліннага паходжання). Той жа гашыш трапляе ў краіну з Марока праз Іспанію. Выраб «сінтэтыкі» стаў дарагім, а лагістыка з тэрыторыі Кітая — больш рызыкоўнай. Летась у Кітаі спынена дзейнасць 438 нелегальных наркалабараторый, у шэрагу выпадкаў канфіскаваліся гатовыя наркотыкі вагой больш за тону.

ПРАГА ЛЁГКІХ ГРОШАЙ

Чаму наркагандлярамі становяцца дзеці з забяспечаных сем'яў?

Два гады таму, каб неадкладна процідзейнічаць незаконнаму абароту наркотыкаў, заканадаўства зрабілі больш жорсткім. Тэрміны зняволення павялічылі, і за кратамі аказалася шмат людзей, у тым ліку маладых. Напрыклад, у папраўчай калоніі «Воўчыя норы» сямі з дзесяці зняволеных няма і 30 гадоў. Чаму моладзь увязваецца ў гэты бізнес? І якія меры прафілактыкі найлепшыя?

Тое, што адбывалася ў 2014 годзе, цяпер ужо не памятаюць. А тады СМІ паведамлялі аб жудасных выпадках. За той год сярод моладзі быў зафіксаваны 1351 выпадак перадазіроўкі і 53 смерці ад наркотыкаў. Менавіта гэта прымусіла дзейнічаць неадкладна і прыняць Дэкрэт №6.

— Зрабіць заканадаўства больш жорсткім было вымушанай мерай, — упэўнены **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і процідзеянні гандлю людзьмі МУС Андрэй САЛАДОЎНІКАЎ.** — Мы бачым, што ў нас становіцца менш наркотыкаў, мы навучыліся працаваць у інтэрнэце. Цяпер мы падбіраемся да асноўных лідараў. Знізілася колькасць перадазіровак: калі за першае паўгоддзе 2016-га было 485 выпадкаў, то за аналагічны перыяд сёлета — 253.

Нярэдка за распаўсюджванне наркотыкаў пападаюцца дзеці з забяспечаных сем'яў. «Яны хочуць даказаць, што штосьці могуць у гэтым жыцці, заставацца на тым жа фінансавым узроўні, да якога прывыклі, — мяркуе **намеснік начальніка ўпраўлення гэтага ж падраздзялення Кацярына ШЭЛЕГАВА.** — Памятаю адзін выпадак. Бацька хлопчыка валодаў сеткай заакрамаў. Калі сыну споўнілася 17, сказаў, што цяпер няхай сам сябе забяспечвае. Падлетак і пайшоў гандляваць — наркотыкамі».

Чаму дзеці ўвязваюцца ў гэты нелегальны бізнес? Па назіраннях міліцыі, усяму віной прага лёгкіх грошай. Да таго ж рэкруцеры ў інтэрнэце, якія ўцягваюць падлеткаў у гэта, выкарыстоўваюць прафесійныя псіхалагічныя метады.

— Я цяпер пасля кожнага затрымання задаю чалавеку пытанне: ці ведаў ён, што яго занятак прывядзе да кратаў? І ў большасці выпадкаў хлопцы разумелі, што пападуцца! — адзначае Андрэй Саладоўнікаў. — Вядома, для бацькоў сваё дзіця — самае лепшае. Барані бог, каб такая бяда прыйшла ў сям'ю. Але не трэба свае памылкі перакладваць на плечы іншых людзей ці абвінавачваць дзяржаву.

Па словах праваахоўнікаў, бацькі часта не заўважаюць, што іх дзеці звязаліся з наркотыкамі, бо прападаюць днямі на працы. Сям'я павінна глядзець, як адзяваецца падлетак, з кім кантактуе, якія тэлефоны ў яго з'яўляюцца, у колькі вяртаецца дадому.

— Мы хадайнічаем у Міністэрства адукацыі, каб праводзіць з моладдзю прафілактычную работу на пастаяннай і больш прафесійнай аснове, — дадае Кацярына Шэлегава. — Для нас самая вялікая праблема — установы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Прынята рашэнне аб унясенні змяненняў у вучэбныя планы. У дысцыпліну «Асновы права» будзе дабаўлена лекцыя «Антынаркатычная палітыка Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе». Таксама будзе выкладацца адказнасць за злоўжыванне ў грамадскім месцы і знаходжанне ў стане ап'янення. Дзяцей трэба інфармаваць, не забываць расказваць пра медыцынскія наступствы ўжывання наркотыкаў. З моладдзю павінны працаваць псіхолагі, урачы. Мы спадзяёмся выкарыстоўваць для гэтага цэнтры, дружалюбныя да падлеткаў, якія існуюць на базе паліклінік. Наступным крокам павінна стаць больш прафесійная работа з бацькамі, каб яны рабілі ўсё неабходнае для бяспекі сваіх дзяцей.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Таямніцы Зямлі

ЗЯМЛЯ ПАЎБОГА,

або Малавядомыя факты пра страчаную Атлантыду

Усе мы чулі пра Атлантыду, легендарны востраў, які за адны суткі пайшоў пад ваду. Хто першы пра гэта даведаўся? Ці існавала Атлантыда на самай справе? Чаго яшчэ мы пра яе не ведаем?

Гісторыя Атлантыды прыйшла да нас у пераказе грэчаскага філосафа Платона. А дакладней, з дзвюх яго работ, «Цімей» і «Крыцій». Лічыцца, што гэтыя кнігі былі напісаныя ў 360 годзе да н. э. У іх Платон пісаў, што грэчаскаму мудрацу Салону стала вядомая гэтая гісторыя, калі ён служыў жрацом у Егіпце. Па вяртанні Салон расказаў яе свайму сваяку Драпіду. Затым Драпід перадаў яе свайму сыну Крыцію, які расказаў яе ўнуку, таксама Крыцію, ну а апошні падзяліўся ёю з Сакратам.

Наступны спіс па версіі навукова-тэхналагічнага партала hi-news.ru варта ўспрымаць не як гістарычны або навуковы факт, а як пераказ Платона. Ці будзем мы верыць у легенду — гэта асабісты выбар кожнага. Навука пакуль не дае дакладных звестак наконт Атлантыды, аднак страчаныя гарады знаходзілі і будуць знаходзіць. Аднойчы гэта можа стаць і легендарны востраў.

Месца вядома

Шмат кніг і дакументальных фільмаў было створана на тэму магчымага месцазнаходжання Атлантыды. Беглы пошук у Гугле пакажа, што некаторыя называюць Сантарын як Атлантыду ў мінулым; іншыя лічаць, што воды Біміні хаваюць дарогу туды. Калі ж узяць за аснову тэкст Платона, ён раскажа нам, дзе некалі знаходзіўся цяпер пагружаны пад ваду горад. У тэксце гаворыцца, што Атлантыда «выйшла з Атлантычнага акіяна». Далей гаворыцца, што «быў востраў перад геркулесавымі слупамі». Сёння гэтыя слупы павінны знаходзіцца на месцы Гібралтарскага праліва, дзе Іспанію і Афрыку падзяляе вузкая палоска мора.

У 2011 годзе археолаг Хартфардскага ўніверсітэта Рычард Фройнд і яго каманда знайшлі «гарады-мемарыялы», ці гарады, пабудаваныя па вобразе Атлантыды. Шэраг з іх быў знойдзены пахаванымі ў нацыянальным парку Данана, што на поўнач ад Кадыса, Іспанія. Аказалася, што Кадыс знаходзіцца проста перад слупамі. Гэта прымусіла Фройнда задумацца пра тое, што сапраўдная Атлантыда была пахаваная ў гразевых балотах Атлантыкі. Яго вынікі супадаюць з тэкстам сюжэта пра тое, што «мора ў гэтых частках непраходнае і глухое, таму што на шляху ёсць дробная грязь; і адбылося гэта з-за асядання вострава».

Кадыс таксама з'яўляецца адным з найстарэйшых гарадоў, якія існуюць у Заходняй Еўропе. Лічыцца, што ён быў пабудаваны фінікійцамі каля 700 г. да н. э., але некаторыя запісы сцвярджаюць, што горад стаяў ужо ў 1100 годзе да н. э. Грэчаскія міфы кажуць, што гэтаму гораду яшчэ больш. Чаму гэта важна? Таму што даўным-даўно гэты горад называлі Гадэсам. Гэта падыходзіць, таму што ў тэксце гаворыцца пра прынца-атланта, якога звалі Гадэйрам дагістарычныя грамадзяне Гадэса. Яму належала далёкаўсходняя частка Атлантыды. Гэта частка вострава павінна была глядзець на сучасны Кадыс. Таму гісторыя кажа, што Кадыс, або Гадэс, быў названы ў гонар прынца. Вядома, Платон пісаў усё гэта па меншай меры праз 340 гадоў пасля адкрыцця горада, таму мог дазволіць сабе вольнасць у назвах атлантычных прынцаў.

Імем паўбога

Большасць людзей думае, што Атлантыда атрымала сваю назву ў гонар Атлантычнага акіяна, але ж насамрэч усё было роўна наадварот. Легенда гаворыць, што ў Пасейдона, грэчаскага бога мораў, было пяць пар блізнят ад смяротнай жанчыны-атланткі па імені Кліта. Бог аддаў кожнаму са сваіх дзесяці сыноў розныя часткі вострава, якімі трэба было кіраваць. Гадэір быў другім па старшынстве. І хоць яго іменем быў названы горад у Іспаніі, менавіта яго старэйшаму брату Атласу дастаўся гонар назваць горад сваім іменем. Будучы першынцам, Атлас займеў цэлы востраў, і нават акіян, які абкружаў яго, быў названы ў яго гонар. Яго дзеці таксама павінны былі правіць Атлантыдай вечна.



Паловы няма

Платон напісаў па меншай меры дзве кнігі аб Атлантыдзе. Існуе поўная версія «Цімея», але поўнай версіі «Крыція» няма. «Крыцій» абрываецца на тым, што Зеўс, валадар грэчаскіх багоў, «сабраў усіх багоў у іх самае святое жытло, якое, будучы змешчаным у цэнтры свету, сузірае ўсе створаныя рэчы. І калі ён сабраў іх разам, то сказаў наступнае». Невядома, ці пакінуў Платон кнігу незавершанай наўмысна, ці ж скончаная версія была даўно страчана. Лічаць таксама, што Платон напісаў ці, прынамсі, планаваў напісаць трэцюю кнігу аб Атлантыдзе — «Гермакрат».

Ёсць некалькі фактаў у падтрымку гэтай тэорыі. Радок у «Крыцыі» кажа: «Крыцій, мы задаволім вашу просьбу і дамо па неабходнасці Гермакрату тое ж самае, што вам і Цімею». Такім чынам, трэцяя частка гісторыі павінна быць прысвечана Гермакрату. Акрамя таго, назвы трох кніг могуць змяшчаць схаванае паведамленне, асабліва калі паглядзець на парадак, у якім Платон напісаў іх. Цімей паходзіць ад грэчаскага «ціа», што азначае «шанаваць». Крыцій выходзіць ад грэчаскага «крыма», што азначае «суд». Гермакрат паходзіць ад «Гермеса», пасланца грэчаскіх багоў. «Цімей» шануе дагістарычныя Афіны за іх гераізм, «Крыцій», як мяркуецца, заканчваецца судом Зеўса над Атлантыдай, але якое пасланне мог перадаць «Гермакрат»?

Адказ можа заключацца ў тым, што мы ведаем пра самога Гермакрата. Ён быў сапраўдным ваенным лідарам, які дапамог узняволіць паспяховую абарону Сіракуз супраць Афін падчас Пелапанескай вайны. Падобна на гісторыю Атлантыды. У гэтай гісторыі афінская дзяржава з дагістарычных часоў адбіваецца ад нападзенняў перавышаючых сіл Атлантыды. Магчыма, пасланне Гермакрата датычылася таго, чаму атака Афін на Сіракузы правалілася і як Сіракузы змаглі адбіцца ад заваявання. Калі толькі хтосьці не знойдзе копію гэтай кнігі, мы можам ніколі і не даведацца пра поўную гісторыю Атлантыды.

Не менш за 11 500 гадоў

Салон лічыўся самым мудрым з усіх грэчаскіх мудрацоў. У тэкстах гаворыцца, што гісторыя Атлантыды была пераказана яму ў Егіпце, калі ён хацеў «выцягнуць» з жрацоў самыя старажытныя іх паданні. Каб зрабіць гэта, Салон вырашыў расказаць святарам пра самыя старажытныя грэчаскія гісторыі, якія змог успомніць. Выслухаўшы Салона, адзін жрэц адказаў: «О Салон, Салон, няма сярод вас старых людзей... Свядомасцю вы ўсе юныя, няма сярод вас старога меркавання, перанесенага традыцыямі». Тады жрэц расказаў, што Афіны, родны горад Салона, былі значна старэйшыя, чым той думаў. У запісах егіпцян у Сайсе было сказана, што Сайс быў заснаваны за 8000 гадоў да гэтага. І таксама было запісана, што Афіны былі заснаваны за 1000 гадоў да Сайса, што афіняне таго часу ваявалі з атлантамі.

Салон жыў прыкладна з 630-га да 560 года да н. э. Калі гэтая гісторыя дакладная, падзенне Атлантыды здарылася прыкладна ў 9500 годзе да н. э. І значыць, Атлантыда павінна быць узростам з Габеклі Тэпэ, які з'явіўся за 10 000 гадоў да н. э., і лічыцца найстаражытнейшым у свеце храмам.

Імперыя, а не востраў

Большасць людзей, мабыць, уяўляюць сабе Атлантыду як пышны зялёны востраў, акружаны глыбокімі сінімі акіянскімі водамі. Хоць гісторыя адбываецца на востраве, большасць з нас, магчыма, мяркуюць, што гэтым вострава Атлантыда і абмяжоўвалася. Але Платон піша, што Атлантыда была імперыяй, якая кіравалася з гэтага вострава. «На гэтым востраве Атлантыды была вялікая і выдатная імперыя, якая панавала над усім востравам і некалькімі іншымі, а таксама над часткамі кантынента, і, акрамя таго, людзі Атлантыды пакарылі Лівію да гераклавых слупоў, да Егіпта і Еўропу да Тырэніі».

Тырэнія — гэта іншае назва Этрурыі, цяпер вядомай як цэнтральная Італія. Гэта значыць, што Атлантыда распасціралася б да сучаснай Тасканы ў Еўропе і да Егіпта ў Афрыцы. Хацелі б мы ведаць, як афіняне перамаглі такую вялікую імперыю? Можа быць, Платон і сам не ведаў, таму вырашыў не дапісваць канцоўку.

Ведалі пра Амерыку

Хоць цалкам можа быць, што Платон стварыў Атлантыду дзеля філасофіі, ёсць у гэтай гісторыі адна частка, якую было б складана сфабрыкаваць. У гісторыі егіпецкі жрэц кажа Салону: «Гэты востраў адкрываў шлях да іншых астравоў, і з іх вы маглі перайсці на супрацьлеглы кантынент, які абкружаў гэты акіян. Прылеглую зямлю можна назваць сапраўды бязмежным кантынентам».

Што ж за кантынент быў па іншы бок Атлантыкі, настолькі вялікі, што здавалася, быццам ён акружае цэлы акіян? Ці можа гэта азначаць, што старажытныя грэкі і, магчыма, старажытныя егіпцяне ведалі пра Амерыку і нават бывалі там?

У 1970 годзе знакаміты мараплавец Тур Хеердал адплыў з экіпажам з шасці чалавек у трысняговым караблі пад назвай «Ра II». Яны даплылі з Сафіі ў Марока праз Атлантыку ў Барбадас за 57 дзён. Гэта падарожжа даказала, што трысняговыя лодкі могуць выжыць у акіянскіх падарожжах і што старажытныя людзі фактычна маглі на іх перасекчы Атлантычны акіян. Гэта подзвіг калісьці лічыўся немагчымым. Але гэта не даказвае, што егіпцяне ці грэкі прарабілі шлях у Амерыку, Хеердал даказаў толькі тое, што гэта магчыма.

Не хадзіце да акіяна

Калі б грэкі сапраўды ведалі, што ляжыць за межамі Міжземнага мора, захацелі б яны, каб іншыя людзі таксама даведаліся? Можа быць, і не. Магчыма, таму Платон пісаў, што нікому нельга плыць у Атлантычны акіян. «Але потым адбыліся моцныя землятрусы і паводкі; і ў адзін дзень, і ў адну ноч няшчасцяў усе здольныя біцца мужчыны пайшлі пад зямлю, і востраў Атлантыда сапраўды таксама сышоў у бездань мора». Па Платоне, у выніку гэтага з'явіліся непраходныя наносы бруду ў Гібралтарскім праліве. Ён настойваў, што ў Атлантыку пры яго жыцці плаваць нельга, «бо ў тыя дні Атлантыка была суднаходнай».

Няўжо Платон спрабаваў утрымаць людзей ад падарожжа праз Атлантыку? Ён сапраўды лічыў, што плыткі бруд блакуе акіянскія шляхі? Або Атлантыка была занадта бруднай, каб лодкі маглі прайсці ў тыя часы?

Беднае чалавецтва

Егіпецкі жрэц расказаў Салону, што ні адна з яго гісторый не была «праўдзіва старажытнай» у параўнанні з яго ўласнай. На думку жраца, прычына таго, што Салону бракавала «праўдзіва старажытных» ведаў, заключаецца ў тым, што чалавецтва вынішчалася зноў і зноў. «Былі і зноў будуць знішчэнні чалавецтва па розных прычынах; найвялікшыя з іх прыносілі праявы агню і вады, меншыя — незлічоныя іншыя прычыны». Далей жрэц тлумачыў: «Калі багі чысцяць Зямлю патокам вады, у жывых застаюцца толькі пастухі, якія жывуць у гарах».

Калі адзіныя людзі, якія выжываюць пасля катаклізмаў, гэта жыхары гор, што не ведаюць свайго далёкага мінулага, лёгка ўбачыць, як уся гісторыя цывілізацыі з часам губляецца. Жрэц лічыў, што Егіпет перажываў гэтыя катаклізмы, таму што ў Егіпце наогул амаль не ішлі дажджы, у той час як іншым гэта не ўдавалася. Замест гэтага здараліся штогадовыя патопы з-за разліву Ніла, якія падымаліся дастаткова, каб накарміць ураджай, але не знішчыць іх свет.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

«АД ДУШЫ ДАЮ, НЕ ПАДУМАЙЦЕ НІЧОГА ДРЭННАГА!»

Пра Адэсу з гумарам і без

«А шо вы глядзіце на экран? Ідзіце і глядзіце Адэсу» ...Я збіралася ў адпачынак. Пачынаўся кастрычнік, а мне вельмі хацелася да мора — і нават не купацца, а проста пахадзіць па ўзбярэжжы, паслухаць шум прыбою, падыхаць салёным паветрам. Сядзела за камп'ютарам, думала пра Балтыку, але выпадкова наіснула на рэкламную спасылку і перайшла на сайт адэскай турфірмы. І першае, што ўбачыла, — гэты радок: «А шо вы глядзіце на экран?»... Так на працягу 10 хвілін я вызначылася з напрамкам.
Безумоўна, я разумела, што наўрад ці рэальныя адэсіты будуць сыпаць направа і налева жартамі і дасціпнымі фразамі, але падспудна, мабыць, усё ж спадзявалася на нешта падобнае. У выніку, як і ў любой паездцы, было і смешнае, і сумнае, і кранальнае, і тое, што прымусіла задумацца...



Славуты адэскі дом з адной сцяны.

«А шо вы не стаіце ў мяне над душой?»

Адны з першых мясцовых жыхароў, з якімі сутыкаецца турыст у любым пункце свету, — гэта кіроўцы. Не буду зараз пісаць пра таксістаў, якія ўсюды стараюцца хоць крыху, а часам і без меры, зарабіць на даверы прыезджых (наступным днём адзін з іх прапанаваў адвезці мяне на Дэрыбасаўскую, ад якой я была за 200 метраў). Але мяне здзівілі кіроўцы адэскіх маршрутак. Я, вядома, не так шмат ездзіла па горадзе, таму выбарка будзе нерэпрэзентатыўнай, але маршрутчыкі, з якімі давялося сутыкнуцца, усе як адзін былі меланхалічнымі і нейкімі змучанымі, а на мае спробы спытаць, дзе мне лепш выходзіць, толькі абыякава махалі рукой. Але на паверку яны аказаліся вельмі нават спагаднымі людзьмі, таму што далей усё развівалася па наступным сцэнарыі: калі я, вырашыўшы не спадзявацца на дапамогу кіроўцы, глядзела па баках і прыкідвала, ці не пара ўжо спытаць пра патрэбную вуліцу ў іншых пасажыраў, ён, як правіла, сам звяртаўся да мяне: «А шо вы не стаіце ў мяне над душой? Вам праз тры (адзін, пяць ці два) прыпынкі выходзіць!» А адзін нават спыніўся, каб высадзіць мяне не на прыпынку, а там, дзе мне, на яго думку, будзе зручней.

Хоць спыніцца не на прыпынку можа і адэскі трамвай! Я надоўга запомню кіроўцу трамвая нумар пяць, які са сваёй кабінкі гучна каментаваў усё, што адбывалася ў яго полі зроку. Спыніўшыся на святлафоры, ён убачыў на скрыжаванні сваю знаёмую і стаў ёй гукаць... Потым спыніўся недзе па дарозе, каб падабраць чалавека, і тут жа закрычаў: «Ды асцярожней ты, пад машыну не пападзі, я не хачу з-за цябе сесці!» Што да яго асабістага жыцця, то, пакуль я ехала, з гучнагалосых размоў мімаволі даведалася, што ён кіруе трамваем ужо пяць гадоў, да гэтага працаваў на трох працах адначасова, вельмі стамляўся і грошай пастаянна не хапала...

Так, у нас таксама па многіх вакансіях прапануюць невысокія аклады, але і пра ўкраінскія зарплаты мы ўсе шмат чулі. Гід, які водзіць экскурсіі па знакамітых адэскіх катакомбах, аказаўся па адукацыі доктарам. На маё пытанне, чаму не працуе па спецыяльнасці, адказаў сустрэчным пытаннем. (Дарэчы, тыпова адэская з'ява. Тут нават жартуюць: «Адэсіта пытаюцца: Ці праўда, што ў вас усе адказваюць на пытанне пытаннем? — Хто вам такое сказаў?») Дык вось, ён адказаў: «А што мне, за 150 долараў працаваць?»

***

Між іншым, экскурсій па Адэсе шмат, і яны не надта дарагія. Можна пахадзіць па «літаратурнай Адэсе», азнаёміцца з «бандыцкай Адэсай», ёсць экскурсіі па месцах здымак «Ліквідацыі», гастранамічныя туры, прагулкі з экскурсаводам па адэскіх вуліцах і дворыках... На жаль, цяпер шматлікія скразныя або проста цікавыя дворыкі зачыненыя мясцовымі жыхарамі, але экскурсавод правядзе вас па іх і з сапраўдным адэскім гумарам раскажа займальныя гарадскія гісторыі, якія дазволяць адчуць той самы каларыт, дзеля якога варта ехаць у Адэсу.

Асабіста мне менавіта на экскурсіі паказалі, куды трэба стаць на адной з маленькіх вулачак, каб убачыць дом з адной сцяны. Пры пабудове гэтага дома не хапіла грошай, і, каб скончыць праект, кемлівыя адэсіты прыдумалі арыгінальнае рашэнне. Яны ўзвялі будынак трохкутнай формы, і такім чынам зэканомілі на задняй сцяне.

З экскурсаводам я паскакала на Цешчыным месце, каб адчуць, што ён сапраўды хістаецца. Гісторыя гэтага самага доўгага (130 м), высокага (30 м) і вузкага моста ў Адэсе таксама цікавая. Паводле легенды, ён быў пабудаваны па распараджэнні М. Сініцы — першага сакратара абкама партыі. Кажуць, гэты Сініца вельмі любіў цешчыны бліны, а жылі цешча і зяць на розных бульварах, і хадзіць акружной дарогай яму было далёка. Так і ўзнікла ў Сініцы ідэя пабудовы гэтага моста, які практычна не меў ніякага камунікацыйнага значэння для горада...

А яшчэ адзін экскурсавод параіў, як паглядзець знакаміты адэскі оперны тэатр унутры, таму што проста так зайсці ў яго днём нельга. Можна пайсці з экскурсіяй, якая каштуе 150 грыўняў. Але, раз экскурсіі па тэатры водзяць канкурэнты, наш экскурсавод падказаў купіць білет на балет або ў оперу, цэны на якія пачынаюцца ад 40 грыўняў, правесці прыгожы вечар у тэатры і ўдосталь палюбавацца і пафатаграфаваць прыгожыя інтэр'еры. «А калі не хочаце ісці на спектакль, то і не трэба: пахадзіце па тэатры і сыходзьце», — дадаў ён.

Заторы — бяда Адэсы.

«А што вы хочаце? Дзякуй, што яшчэ вуліцы падмятаюць»...

А вось «інтэр'еры» шматлікіх адэскіх пад'ездаў непадрыхтаванага чалавека могуць, мякка кажучы, збянтэжыць. Я зайшла ў адзін такі пад'езд у доме па цэнтральнай вуліцы Спірыдонаўскай і спачатку падумала, што ён нежылы. Ну, дом стары, можа, жыхароў адсялілі... Але, гляджу, на кожным паверсе — відэакамера. Пакуль стаяла, з кватэры на верхнюю пляцоўку «выкаціліся» два жыццярадасныя дашкольнікі і з крыкамі пабеглі міма мяне ўніз. За імі паважна выйшлі іх бацькі — прыстойнага выгляду, не бамжы якія-небудзь.

Я задала бестактоўнае пытанне:

— Скажыце, гэты пад'езд жылы?

— Жылы, вядома! — здзівіліся яны.

— А чаму тут усё так? — і я павяла рукой, далікатна абазначыўшы праблему.

— Гэта стары адэскі дом, — і, мабыць, палічыўшы тлумачэнне вычарпальным, яны накіраваліся да выхада.

А жанчына сярэдніх гадоў у дварэ сказала: «А што вы хочаце? Дзякуй, што яшчэ вуліцы падмятаюць»...

Шчыра кажучы, я не ўтрымалася і ад таго, каб сфатаграфаваць пару жыровак з запазычанасцю, якія ляжалі ў тым пад'ездзе. Аказалася, гэта вельмі вострая праблема для Адэсы. А філіял «Інфоксводаканал» выклаў у адкрытым доступе інфармацыю, што па стане на 1 кастрычніка агульны доўг насельніцтва горада за спажытую ваду перавысіў 140 млн грыўняў, — адзначыўшы, што ў гэтым годзе пабіты рэкорды запазычанасці за ўсю гісторыю адэскага водаканала. Спецыялісты прадпрыемства заяўляюць, што з-за неплацяжоў водаканалу катастрафічна не хапае абаротных сродкаў для пакрыцця ўсіх выдаткаў, — і гэта ў любы момант можа прывесці да спынення помпавых станцый і перабояў у пастаўцы вады.

***

... Кажуць, ніхто не застаецца абыякавым да адэскага Прывозу. Я трапіла на знакаміты рынак толькі бліжэй да вечара, калі гандлёвыя рады ўжо згортваліся, таму ўся іх маляўнічасць і каларыт, можна сказаць, прайшлі міма мяне. Тым не менш сёй-той яшчэ гандляваў. Я спынілася перад маладым мужынам, які прадаваў грушы. 35 грыўняў? Ды гэта амаль як у нас, а як жа танная паўднёвая садавіна? Убачыўшы, што я збіраюся ісці, прадавец махнуў рукой: «Добра, бярыце за 30». Я пагадзілася. «І кінзу заадно вазьміце, — працягнуў ён мне пучок зеляніны. — Суп зварыце, ведаеце, які смачны суп з кінзой!» «Ды не трэба мне, не буду я суп варыць», — спрабавала адгаварыцца я, але прадавец не адставаў. «Добра, бярыце бясплатна, — зрабіў ён шырокі жэст. — Ад душы даю, не падумайце нічога дрэннага!» «Вось табе і байкі аб сквапных адэсітах», — толькі і падумала я. Але праз 10 секундаў высветлілася прычына такой шчодрасці. Да прылаўка падышоў іншы прадавец, а мой растлумачыў: «Гэта яго тавар...» — паклаў мне кінзу ў пакет, усміхнуўся і падміргнуў...

***

А цяпер пра сур'ёзнае, хоць і тут не абышлося без смеху, нават калі гэта смех скрозь слёзы. У тыя дні, што я была ў Адэсе, уся Украіна — у транспарце, крамах і проста на вуліцы — абмяркоўвала пенсіі. Іх нарэшце паднялі, праўда, не ўсім (ва Украіне 12 млн пенсіянераў, пенсіі павысілі — дзевяці мільёнам). І павысілі вельмі па-рознаму: камусьці на 50 грыўняў, а камусьці — на семсот. З навін стала вядома, што пенсіі паднялі толькі тым, хто іх атрымліваў на агульных падставах, а вось ваенныя і навуковыя не пералічвалі. Акрамя таго, тыя, хто выходзіў на заслужаны адпачынак у 2014—2016 гадах, атрымалі толькі мінімальныя надбаўкі. У цэлым, мяркуючы зноў жа па навінах, большасць пенсіянераў атрымаюць прыбаўку ў 200 грыўняў (прыблізна сем долараў).

І вось уся Украіна стала цікавіцца памерамі чужых надбавак і дзяліцца інфармацыяй аб сваіх. Зразумела, што хтосьці (той, у каго надбаўка аказалася меншая) заканчваў размову моцна расчараваным...

«Майму бацьку паднялі пенсію амаль на тысячу грыўняў, ён такі задаволены!» — расказвала ў чарзе маладжавая жанчына. «Мая мама таксама была задаволеная, — адказала яе суседка. — Да таго часу, пакуль не дазналася, што куме паднялі пенсію на 500 грыўняў больш!» Увогуле, атрымалася так, што адзін радуецца, другі затаіў крыўду, а нехта так знерваваўся, што ўжо тыдзень п'е лекі ад ціску...

***

І напрыканцы: у Адэсе, як мне падалося, шмат прыезджых. Яны выглядаюць як мясцовыя, уладкаваліся на працу і гэтак далей, але ў іх ні пра што нельга спытаць, таму што горада яны не ведаюць. Часам гэта раздражняла: у каго ні спытаеш, як прайсці, — усе толькі разводзяць рукамі (моладзь, праўда, адразу лезла ў тэлефон і шукала даведку там...). І гэта дакладна не таму, што я пыталася на рускай мове, бо ўся Адэса на ёй размаўляе.

А калі мне трэба было ад'язджаць, я выклікала праз Убер (амерыканская міжнародная кампанія, філіял якой ёсць і ў Адэсе) таксі да аэрапорта. Спачатку чакала спакойна, потым выйшла на вуліцу з чамаданам — машыны ўсё няма. А самалёт чакаць не будзе! Нарэшце тэлефануе кіроўца: «Скажыце, а дзе вы знаходзіцеся?» У майго гатэля, які каля самага мора, прыгожы адрас: пляж Ланжэрон, 65. Называю яго яшчэ раз і чую ў адказ: «А дзе гэта?»

Ён ператэлефаноўваў мне яшчэ два (!) разы, а я ў думках лічыла зніклыя грошы — званкі ж міжнародныя, праз роўмінг (так і аказалася: за размовы давялося заплаціць больш, чым за таксі). Грошай было шкада... І калі ён нарэшце мяне знайшоў, я была не надта добразычлівая.

— Вы што, не мясцовы? — спытала я.

— Не, — адказаў ён.

— І адкуль?

— Там, дзе я жыў, цяпер вайна.

Мне неяк адразу стала не па сабе. І такой дробяззю здалося ўсё, пра што я думала толькі што! Не ведаю, што там у яго з навігатарам, але, калі кампанія папрасіла аценіць паездку, напісала «ўсё добра»...

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

Бяздомныя сабакі ў Адэсе маюць чыпы.

Пад'езд «старога адэскага дома».

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

Наименование	Характеристика
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, место-нахождение объекта	Право заключения договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 82,2 кв. м по адресу г. Гродно, ул. Буденного, 37
Начальная цена продажи	312,36 руб. (триста двенадцать рублей тридцать шесть копеек) с учетом НДС
Применяемый коэффициент при расчете арендной платы	В зависимости от спроса на недвижимое имущество, его техническое состояние и коммерческой выгоды – 2,0
Сумма задатка	31 руб. (тридцать один рубль)
Условия аукциона	Целевое назначение арендуемых помещений – склад, производственное помещение, офис, оказание услуг, розничная торговля
Продавец	УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия оплаты	7 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)
Срок заключения договора аренды	Не позднее 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды
Номер р/с для перечисления задатка	Y44BLBBJ30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 28 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

– индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 22 ноября 2017 г. до 15.00

Телефон для справок 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	Комплекс стоматологический КС-2 «белдент-2» (полная потребляемая мощность – 200 ВА, масса – 270 кг, режим работы – повторно-кратковременный).
Начальная цена продажи	10 549,43 р. (десять тысяч пятьсот сорок девять рублей сорок три копейки)
Сумма задатка	1055 руб. (одна тысяча пятьдесят пять рублей)
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненский филиал РУП «Белпочта», 230025, г. Гродно, ул. К. Маркса, 29, тел. 745-322
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия оплаты	Демонтаж оборудования за счет собственных средств покупателя по адресу: г. Гродно, ул. К. Маркса, 29
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 30 ноября 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.06.2017 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 27 ноября 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

ООО «Фрондера» извещает об отмене проведения аукциона, назначенного на 30.11.2017, в части продажи Лота №5 и Лота №6 (Таблица №2), принадлежащих ГУК ДТП «Автокомбинат «Облсельстрой».

УНП 192789344

Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договора аренды нежилых помещений

Аукцион состоится 19 декабря 2017 года в 14.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком», в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр. Машерова, 21-2.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

Лот №1: Помещение на 1-м этаже со вспомогательной площадью в изолированном помещении (изолированное помещение №2) общей площадью 17,3 кв. м по пр-ту Машерова, 21-2 в г. Бресте.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права – **4,325** базовых арендных величин, размер задатка – **0,4325 базовых** арендных величин, согласно п. 8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 №150 установить коэффициент – 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Документы на участие в аукционе по объекту: помещение на 1-м этаже со вспомогательной площадью в изолированном помещении (изолированное помещение №2) общей площадью 17,3 кв. м по пр-ту Машерова, 21-2 в г. Бресте принимаются с 17 ноября 2017 года по 18 декабря 2017 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21-2, каб. №416.

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

– перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» №BY26AKBB30121001100011000000 ф-л №100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC) – AKBBBY21100, УНП 201003265;

– подает заявление на участие в аукционе;

– заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

– предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

– физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

– индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

– юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды.

